РАРЫТЭТЫ СУСВЕТНАЙ ЗНАЧНАСЦІ Ў МІНСКУ 4

МАЛАДЗЕЧАНСКАЯ ШКОЛА ВЫЦІНАНКІ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 ВЕРАСНЯ 2018 г. АЎТОРАК № 179 (28795)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ШУНЕВІЧ, міністр унутраных спраў:

«Любая сацыяльная дзейнасць павінна адбывацца па пэўных правілах, калі гэтых правілаў няма, то адбываецца анархія, безуладдзе і прыніжэнне правоў, свабод і асобы грамадзяніна. Калі такіх правілаў няма, то яны павінны быць распрацаваны. Адказнасць за здзяйсненне супрацьпраўных дзеянняў, усё роўна ў якой сферы, галіне або форме, павінна наступаць безумоўна. Аўтарызацыя ў інтэрнэце дысцыплінуе грамадства, карыстальнікаў у сетках. Таму што, давайце прызнаемся, інтэрнэт зараз — гэта зона абсалютна безадказных паводзінаў, меркаванняў, абраз, распаўсюджвання паклёпу... Зыходзячы з гэтага, лічу мэтазгодным, правільным і своечасовым вырашэнне пытання аб ідэнтыфікацыі ўдзельнікаў гэтага працэсу. Гэта дысцыплінуе тых людзей, якія сёння не ведаюць ні правоў, ні межаў, ні ўмоўнасцяў, маралі, прынцыпаў. Усёдазволенасці ў нейкай ступені будзе пастаўлены бар'ер».

КАРАТКА

• ВУП Беларусі ў студзені—жніўні 2018 года вырас на 3,7 % у параўнанні з леташнім.

• Першы ў свеце цягнік на вадародных паліўных элементах Coradia iLint выканаў 16 верасня тэставы рэйс у Ніжняй Саксоніі.

• Савет Міністраў пастанавіў зацвердзіў палажэнне аб парадку продажу незапатрабаванага дзяржжылля ў сельскай мясцовасці.

• Раку Прыпяць пад мостам у Жыткавіцкім раёне вяртаюць у звыклае рэчышча.

• У Быхаўскім раёне на працягу года будзе забаронены продаж алкаголю ўначы (з 23.00 да 7.00).

■ Свята горада

З КАРАЛЕЎСКІМ РАЗМАХАМ

Гродна адзначыў 890-гадовы юбілей

Фота БелТА.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар ЖУК, генеральны дырэктар ААТ «Малочны Свет» Марына АНІКЕЕВА, касманаўт Алег НАВІЦКІ.

Больш за 100 тысяч чалавек наведалі свята горада, на якім можна было сустрэцца з гараднічым, убачыць сілача, прадэгуставаць новы сыр, зрабіць сэлфі з касманаўтам...

Урачыстасці пачаліся яшчэ напярэдадні святочнай даты. У Гродзенскім абласным тэатры адбылося ўрачыстае пасяджэнне, на якім ушанавалі гараджан з прысваеннем ім звання «Ганаровы грамадзянін Гродна» і тых, чые імёны папоўнілі Кнігу Славы. Найлепшыя работнікі розных сфер дзейнасці атрымалі Ганаровыя граматы аблвыканкама. **Старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Мечыслаў ГОЙ** адзначыў, што гэта свята аб'ядноўвае ўсіх гараджан. І тых, хто лічыць Гродна сваёй радзімай, і тых, хто робіць яго камфортным і зручным для пражывання.

СТАР. 6

■ Белая вежа — 2018

САПРАЎДНАЕ І ПРЫВІДНАЕ

Вось і апусцілася заслона 23-й «Белай вежы». Сёлетні фестываль быў крыху карацейшы за папярэднія, ён працягваўся шэсць дзён замест васьмі. Але ж сустрэча гледачоў з сапраўдным мастацтвам адбылася, і гэта радуе.

Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Міжнародны форум «Белая вежа» не першы раз адкрываў Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы. Пра «Рэвізора» ў пастаноўцы Мікалая Пінігіна і Дзмітрыя Цішко падрабязна расказвала наша газета. Можна толькі адзначыць, што брэсцкая публіка аказалася ўдзячнай, цудоўную ігру Віктара Манаева ў ролі Гараднічага і яго калег у Брэсце ацанілі. А калі галоўны герой вымаўляў фразы ці маналогі, некаторыя гледачы азіраліся на рад, у якім сядзелі кіраўнікі гарадской і абласной вертыкалі: як успрымаюць? Але яны гэтак жа весела смяяліся і шчыра апладзіравалі. Словам, гогалеўскі сюжэт з адаптацыяй на тутэйшае жыццё стаў добрым пачаткам фестывалю.

СТАР. 5

■ Разумныя грошы

Ці можна кіраваць попытам спажыўцоў?

Ад спантаннай пакупкі са «зніжкай па-беларуску» можна не толькі не атрымаць якой-небудзь эканоміі, але і пераплаціць за яе.

Абсалютна ўсе гандляры хочуць каардынаваць паводзіны сваіх кліентаў. А інструменты прыцягнення пакупніка грунтуюцца на эканоміі іх фінансавых выдаткаў. Апошнім часам банкі сумесна з гандлёвымі сеткамі (магазінамі і не толькі) стварылі сумесны прадукт — так званыя праграмы лаяльнасці. Цяпер у краіне дзейнічае каля 20 найбуйнейшых такіх праграм. Пра тое, што лепш для наведвальнікаў крам, мы пагаварылі з **кіраўніком адной з іх, экспертам Алегам ЗАХАРАВЫМ.**

— Алег Уладзіміравіч, якія існуюць перадумовы для ўзнікнення праграм лаяльнасці ў нашым грамадстве? Мы саспелі для такіх праграм?

— Паўсюль людзі купляюць па адзінай схеме — патрэбна ежа, адзенне, прадметы гігіены і іншае. І кожны з нас стараецца купіць як мага танней, але, у той жа час, больш карысны прадукт. На гэтым базавым прынцыпе і будуюцца ўсе праграмы лаяльнасці прадпрыемстваў.

СТАР. 7

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 18179>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ І ВЫЙГРАЙ КАРЫСНЫЯ ПРЫЗЫ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Парламенцкі дзённік

ЧАС АКТЫВІЗАЦЫІ

Дыпламатычным адносінам нашай краіны і Інданезіі ўжо чвэрць стагоддзя. Аднак у некаторых сферах супрацоўніцтва можа быць значна пашырана. Напрыклад, у турызме: нягледзячы на бязвіз, летась да нас прыляцелі толькі 30 вандроўнікаў з Інданезіі. Беларусы ж у гэтую азіяцкую краіну ездзяць трохі часцей — 378 чалавек за 2017 год, — аднак патэнцыял для развіцця турыстычнай галіны ўсё адно ёсць. Каб абмеркаваць розныя магчымасці ў супрацоўніцтве, парламенцкая дэлегацыя з Джакарты прыляцела ў Мінск.

Беларускі бок на сустрэчы прадстаўлялі парламентарыі на чале з **Баляславам ПІРШТУКОМ, намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі.** Ён адзначыў, што на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў паміж дзвюма краінамі склаліся добрыя адносіны. Мінулыя візіты заклалі добры фундамент, і цяпер час напоўніць узаемадзеянне канкрэтнымі справамі. Для нашай краіны, як звярнуў увагу парламентарый, Інданезія вельмі важная як сур'ёзны партнёр у рэгіёне АСЕАН. Сёлета намецілася пэўная дынаміка ў росце тавараабароту, але ён усё адно дастаткова сціплы. На думку Баляслава Пірштука, і з інданезійскага, і з беларускага бакоў прапаноў магло б быць больш. Гандаль мог бы павялічыцца ў некалькі разоў.

Што датычыцца статыстыкі, летась тавараабарот паміж Беларуссю і Інданезіяй склаў 158,4 мільёна долараў ЗША, з іх экспарт — 134,6 мільёна, імпарт — 23,8 мільёна. Дарэчы, у 2017 годзе экспарт беларускіх паслуг склаў 219,8 % да ўзроўню 2016-га (48,7 мільёна долараў ЗША). Асноўныя пазіцыі нашага экспарту — калійныя ўгнаенні, грузавыя аўтамабілі, шыны, поліяміды, медыцынская мэбля. З Інданезіі ў Беларусь па выніках мінулага года паступілі прамыя інвестыцыі на чыстай аснове ў памеры мільёна долараў ЗША, сёлета аднак прамых інвестыцый не паступала. Пакуль што па выніках студзеня — чэрвеня 2018 года тавараабарот склаў 115,7 мільёна долараў ЗША.

Па праграме візіту інданезійская дэлегацыя плануе наведаць некаторыя беларускія прадпрыемствы. «Мы ведаем, што ў вас дастаткова нядрэнна развіта сельская гаспадарка. У нас для гэтага створаны практычна ўсе перадумовы для вытворчасці поўнага цыкла сельгастэхнікі, таксама ўсіх мінеральных угнаенняў, — падкрэсліў Баляслаў Пірштук. — То-бок мы маглі б вельмі шчыльна супрацоўнічаць у гэтым кірунку». Акрамя таго, парламентарый нагадаў, што Беларусь займае трэцяе месца ў свеце па вытворчасці горназдабыўной тэхнікі.

У сферы дагавораў Баляслаў Пірштук звярнуў увагу на тое, што сумесныя дакументы, якія былі напрацаваны, маглі б прасоўвацца больш актыўна. Напрыклад, ужо ўступіла ў сілу пагадненне, якое дае магчымасць пазбегнуць двайнога падаткаабкладання, што вельмі важна для бізнесу. Аднак яшчэ не ратыфікавана пагадненне ў галіне інвестыцый, а таксама шэраг іншых дакументаў. Пасля ўступлення ў сілу дагавора паміж урадамі дзвюх краін наконт супрацоўніцтва ў галіне абароннай прамысловасці будзе сфарміраваны беларуска-інданезійскі камітэт па ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. У лістападзе ў Мінску плануецца правесці другое пасяджэнне беларуска-інданезійскай рабочай групы па супрацоўніцтве ў галіне навукі, тэхналогій і вышэйшай адукацыі. Нагадаем, што першае яе пасяджэнне праходзіла тры гады таму.

Налета ў нашай краіне будзе арганізаваны вялікі бізнес-форум, які пройдзе адначасова з сёмым пасяджэннем міжурадавай камісіі Беларусі і Інданезіі. Гэта добрая магчымасць, каб інданезійскі бізнес змог у Беларусь прыехаць і знайсці сегмент, які яго зацікавіць. З тым, што дыялог з Інданезіяй патрабуе актывізацыі, пагаджаецца і **Уладзіслаў ШЧЭПАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па эканамічнай палітыцы, кіраўнік рабочай групы Нацыянальнага сходу Беларусі па супрацоўніцтве з парламентам Інданезіі.** У нас ёсць праграма, якая дазволіць актывізаваць узаемадзеянне і з парламентам Інданезіі, і ў рэальным сектары эканомікі. Мы настроены павялічыць абарот і паслуг, і тавараў з гэтай далёкай прыгожай краінай. Вядома, мы рады бачыць інданезійскую дэлегацыю ў вялікім складзе», — падкрэсліваe Уладзіслаў Шчэпаў. Таксама ён расказаў, што інданезійцы зацікаўлены ў вывучэнні пытанняў па прадухіленні надзвычайных сітуацый. Для іх краіны характэрныя лясныя пажары, таму вельмі важны маніторынг лясных рэсурсаў і сельскай гаспадаркі.

Аданг СУДРАДЖАТ, старшыня інданезійска-беларускай парламенцкай групы дружбы Савета народных прадстаўнікоў (палаты парламенту. ***— Заўв. «Зв.»***) Інданезіі, расказаў, што цікавіць яго падчас гэтага візіту: «Наколькі я ведаю, у Беларусі вельмі цікавыя ўзоры ваенна-тэхналагічнага комплексу». Акрамя гэтага, ён звярнуў увагу на беларускі вопыт у ядзернай энергетыцы.

Надзея АНІСОВІЧ.

ЛАЦІНААМЕРЫКАНСКІ ТЫДЗЕНЬ

Супрацоўніцтва з Кубай мае працяглую і яскравую гісторыю яшчэ з савецкіх часоў. Настаў час абнавіць парадак дня, і для гэтага ў беларускую сталіцу прыляцела Ана Тэрэсіта Гансалес Фрага, намеснік міністра замежных спраў Кубы.

Учора яна сустрэлася з беларускімі парламентарыямі. **Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі,** адзначыў, што ў дзвюх дзяржаў вельмі падобная гісторыя: абедзве краіны паступова выбудоўваюць сваю незалежнасць і эканоміку. Таму, на думку парламентарыя, калі працаваць зладжана, вынікі будуць нашмат больш важкімі, чым сёння. Гэта датычыцца не толькі парламенцкага вымярэння, але і шматвектарнага кірунку. Як падкрэсліў намеснік старшыні, без моцнай эканомікі дыпламатыя не мае фундамента, таму трэба заняцца развіццём партнёрства ў гэтай сферы.

«Мы вельмі зацікаўлены выбудаваць такія сегменты з вашага і нашага боку, каб яна (эканоміка. — ***Заўв. «Зв».***) была ўзаемавыгадная, каб мы знайшлі прымяненне для бізнесу і каб мы ўбачылі гэтыя кропкі росту, якія дазволяць нарасціць наш тавараабарот і прыдадуць нам больш аптымізму», — звярнуў увагу Баляслаў Пірштук. Таксама ён адзначыў, што Беларусь не першы год працуе на лацінаамерыканскім кантыненце і дастаткова многія айчынныя брэнды там добра вядомы. Гэты напрамак для нас важны, у тым ліку па лініі дзейнасці парламента. Дарэчы, у другой палове тыдня плануецца візіт дэлегацыі Лацінаамерыканскага парламента на чале з яго старшынёй Эліясам Кастылья.

Сярод кірункаў, у якіх мы маглі б быць карысныя кубінскім партнёрам, Баляслаў Пірштук назваў ІТ, а таксама адзначыў, што больш уважліва можна паглядзець на медыцыну і ахову здароўя. Акрамя таго, кірункі для работы існуюць і ў гуманітарнай сферы. Ён падкрэсліў, што беларускі бок зацікаўлены, каб адносіны набылі другое дыханне.

Летась у тавараабароце з Кубай мы крыху збавілі: 89,5 % да ўзроўню 2016 года (60 мільёнаў долараў ЗША). Перыяд студзень — ліпень гэтага года паказвае тавараабарот у памеры 11,7 мільёна долараў ЗША.

Надзея АНІСОВІЧ

■

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ДА СІРЫІ СЦЯГВАЮЦЦА БАЯВЫЯ КАРАБЛІ

Да берагоў Сірыі сцягнуты баявыя караблі Другой пастаяннай ваенна-марской групы НАТА, паведамляе «Інтэрфакс» са спасылкай на маніторынгавыя даныя заходніх марскіх рэсурсаў. У гэты момант фрэгаты краін — членаў Паўночнаатлантычнага альянсу, па інфармацыі агенцтва, ажыццяўляюць патруляванне ў непасрэднай блізкасці ад арабскай рэспублікі ў раёне Усходняга Міжземнамор'я.

Раней сваю ваенную групоўку ў Сірыі на фоне паведамленняў аб тым, што ЗША гатовыя нанесці ўдар па арабскай рэспубліцы, калі сірыйскі лідар Башар Асад аддасць загад на выкарыстанне супраць праціўнікаў яго рэжыму хімічнай зброі, пачала нарошчваць і Расія. У канцы жніўня расійскае ваеннае ведамства абвясціла аб тым, што каля берагоў Сірыі яно разгарнула самую магутную эскадру за ўвесь час канфлікту. Павелічэнне расійскай эскадры каля берагоў Сірыі пазней заўважылі ў Паўночнаатлантычным блоку.

Да гэтага афіцыйны прадстаўнік Мінабароны Расіі Ігар Канашэнкаў сцвярджаў, што ЗША нарошчваюць колькасць носьбітаў крылатых ракет у Блізкаўсходнім рэгіёне, рыхтуючыся нанесці па Сірыі новыя ўдары. Падставай для іх Штаты, як неаднаразова заяўлялі раней у Маскве, могуць выкарыстоўваць правакацыю з ужываннем хімічнай зброі ў правінцыі Ідліб. У Пентагоне аб падобных заявах адзываліся як аб «прапагандзе».

КІТАЙСКІЯ БАНКІ ПАДТРЫМАЛІ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ РАСІІ?

Камерцыйныя банкі Кітая затрымліваюць пералічэнні на рахункі расійскіх банкаў або зусім адмаўляюцца праводзіць плацяжы. На гэта паскардзіўся кіраўнік прадстаўніцтва ЦБ Расіі ў КНР Уладзімір Данілаў, якога цытуе ТАСС.

Хоць дэ-юрэ Пекін не ўводзіў ніякіх санкцый супраць Расіі, банкі спасылаюцца на заходнія санкцыі ў якасці прычыны адмовы ў абслугоўванні плацяжоў. Па словах Данілава, пад блакіраванне трапляюць транзакцыі нават тых кампаній, якіх няма ні ў якіх санкцыйных спісах.

Віцэ-прэзідэнт Асацыяцыі банкаў Расіі Анатоль Казлачкоў адзначыў, што праблемы існуюць і трэба шукаць спосабы іх вырашэння. Аднак, як адзначае «Росбалт», цяжкасці пачаліся даволі даўно і працягваюцца да гэтага часу. Яшчэ ў чэрвені 2015 года першы намеснік старшыні ВТБ Юрый Салаўёў скардзіўся на тое, што кітайскія банкі адмаўляюцца праводзіць аперацыі з расійскімі.

Асноўнай валютай расійска-кітайскіх разлікаў па-ранейшаму застаецца долар, нягледзячы на намаганні расійскіх уладаў па пераводзе здзелак на рубель і юань.

ЧАСОПІС TIME ПРАДАДЗЕНЫ ДРУГІ РАЗ ЗА ГОД

Папулярны амерыканскі штотыднёвік з амаль 100-гадовай гісторыяй прададзены другі раз за год, піша амерыканская дзелавая газета The Wall Street Journal. Пакупнікамі сталі сузаснавальнік амерыканскай кампаніі Salesforce Марк Бэніёф і яго жонка Лін Бэніёф. Здзелка абыдзецца сямейнай пары ў $190 млн. Завяршэнне здзелкі чакаецца на працягу 30 дзён. Раней, амаль восем месяцаў таму, кампанія Meredith Corp. набыла за $2,8 млрд выдавецкую групу Time Inc., якой належаць дзясяткі CMI, у тым ліку часопіс Time.

Проведение первых торгов по продаже имущества ООО «Черный егерь»

№ лота	Наименование лота	Начальная цена, руб.	Сумма задатка 5 %, руб.	Шаг торгов 5 %, руб.
1	Здание придорожного кафе (не завершенный строительством единый объект недвижимого имущества инв.№614/U-34310)	178 317,44	8 915,87	8 915,87

Местонахождение**: Минская обл., Смолевичский р-н, автодорога М1/Е30 Брест (Козловичи) – Минск – граница РФ (Редьки), 379 км (лево).**

Характеристики объекта

в состав единого объекта недвижимого имущества входят:

незавершенное законсервированное 2-этажное здание придорожного кафе с цокольным этажом (инв. № 614/U-34310), процент готовности основного строения 44 %, цокольного этажа – 73 %, общая площадь здания 284,2 кв. м;

не завершенные строительством недвижимые улучшения (строительно-монтажные работы по возведению 2-го этажа придорожного кафе), в т. ч. строительные материалы;

земельный участок с кадастровым номером 624800000001000909 (право аренды).

Торги в форме открытого аукциона будут проведены по адресу: г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, каб. 18, начало – **19 октября 2018 г. в 10.00**.

Письменная заявка на участие в торгах и копия документа, свидетельствующего об оплате задатка, должны быть поданы с 09.00 18.09.2018 по 18.00 18.10.2018 по адресу организатора торгов.

Задаток на участие по лоту составляет 5 % от его начальной цены и должен быть перечислен по **18.10.2018** на расчетный счет продавца – ООО «Черный егерь», 222201, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Торговая, д.14В, р/с BY14 TECN 3012 1363 1001 4000 0000, в ОАО «Технобанк», г. Минск, ул. Кропоткина, д. 44, код TECNBY22, УНП 690821358, назначение платежа: задаток по лоту (наименование лота и его номер) для участия в торгах **19.10.2018.** Организатор торгов: ООО «БизнесУэй», г. Минск, ул. Антоновская, д. 2, комн. 18, тел. +37 5(29) 165-33-65. Продавец: **ООО «Черный егерь».** Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия. Цена без НДС (УСН). В случае признания торгов несостоявшимися по причине участия одного претендента лот может быть продан ему с его согласия по цене, увеличенной на 5 % от начальной цены. Победителем торгов (претендентом на покупку) возмещаются затраты на организацию и проведение торгов в размере **225,60 руб.** Срок подписания договора купли-продажи по 29.10.2018. Правила и порядок проведения торгов, оформление участия в открытых торгах указаны на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве www.bankrot.gov.by в разделе «Должник – ООО «Черный егерь» – имущество – реализация».

Даходы выраслі

Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў студзені — ліпені склалі 107,7 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду 2017 года, паведамілі **БелТА** ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У агульным аб'ёме грашовых даходаў аплата працы займае 64,3 працэнта, даходы ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, — 7,9 працэнта, трансферты насельніцтву (пенсіі, дапамогі, стыпендыі і іншыя) — 23,4 працэнта, даходы ад уласнасці і іншыя даходы — 4,4 працэнта.

■ Прамая лінія

З клопатам пра малую радзіму

У мінулую суботу прайшла чарговая прамая лінія жыхароў вобласці са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Анатолем ЛІСАМ. Да губернатара дазваніліся 28 чалавек. Людзей хвалявалі самыя розныя праблемы: работа жыллёва-камунальнай гаспадаркі, эфектыўнае выкарыстанне зямлі, ахова навакольнага асяроддзя, парадак выдачы крэдытаў, а таксама навагодняе ўпрыгожанне населеных пунктаў.

Жыхары Лунінецкага раёна паскардзіліся на працяглую адсутнасць гарачай вады ў іх дамах. Шматдзетная сям'я з Кажан-Гарадка хоча атрымаць субсідыю на пакупку жылля. Жыхарка Кобрына лічыць неналежнай арганізацыю асвятлення вуліц Цаглянай і Шырокай. Сяльчане з Ганцавіцкага раёна задавалі пытанне па медыцынскім абслугоўванні ў вёсцы Чудзін. А Міхаіл Сямёнавіч, напрыклад, хоць і жыве ў Бярозе, перажывае за сваю малую радзіму — вёску Бабровічы Івацэвіцкага раёна. У Матыкалах Брэсцкага раёна закрылі лазню, і жыхары скардзіліся на гэта.

Паступілі таксама званкі-падзякі. Валянціна Мікалаеўна з Высокага Камянецкага раёна ад імя сваіх суседзяў падзякавала за абноўлены да абласных дажынак горад. А неабыякавая брастаўчанка ўнесла свае прапановы па каляднай ілюмінацыі абласнога цэнтра.

Некаторыя заяўнікі адразу па ходзе прамой лініі атрымалі адказы. Па тых жа пытаннях, якія патрабуюць дадатковага вывучэння, службовым асобам былі дадзены даручэнні.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■

МІНЧАН ПРОСЯЦЬ ЗАКЛЮЧЫЦЬ ДАГАВОР НА АЦЯПЛЕННЕ КВАТЭР

Арганізацыі ЖКГ Мінска просяць жыхароў да 1 кастрычніка заключыць дагавор на аказанне паслуг па цеплазабеспячэнні для ацяплення і (або) гарачага водазабеспячэння кватэр, паведамілі карэспандэнту БелТА ў дзяржаўным аб'яднанні «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка».

У адпаведнасці з законам «Аб абароне правоў спажыўцоў жыллёва-камунальных паслуг» і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі, асноўныя жыллёва-камунальныя паслугі, да якіх адносяцца і цеплазабеспячэнне (ацяпленне) і (або) гарачае водазабеспячэнне, аказваюцца на падставе дагавораў.

Раней КУП ЖКГ, як выканаўца, заключалі дагаворы з уласнікамі жылых памяшканняў на паслугі па тэхнічным абслугоўванні жылога дома, тэхнічным абслугоўванні ліфта, капітальным рамонце і іншых, акрамя цеплазабеспячэння.

«Па даручэнні ўрада з 2017 года арганізацыі ЖКГ сталі выканаўцамі і па паслузе цеплазабеспячэння. У ліпені 2018 года распрацавана і ўзгоднена прыкладная форма дагавора паміж КУП ЖКГ і насельніцтвам па жылых дамах, што забяспечваюцца цеплавой энергіяй прадпрыемствамі «Белэнерга». Урадам вызначаны тэрміны заключэння дагавораў да 1 кастрычніка 2018 года», — растлумачылі ў аб'яднанні.

Заключаць дагаворы па новых правілах у Беларусі, у тым ліку ў сталіцы, пачалі са жніўня 2018 года. Адпаведныя аб'явы з інфармацыяй для насельніцтва ў Мінску размясцілі ў пад'ездах жылых дамоў.

Спецыялісты дадалі, што ў дагаворах дакладна прапісаны правы, абавязкі і адказнасць бакоў, парадак аплаты аказаных паслуг. Гэта дае магчымасць спажыўцу канкрэтызаваць прэтэнзіі па парушэннях у аказанні паслуг, матывуючы іх пунктамі дакумента.

Еўропа больш не хоча пераводзіць стрэлкі гадзіннікаў

Еўрапейскі саюз адмовіцца ад сезоннага змянення часу ў 2019 годзе. Аб гэтым паведамляе Reuters са спасылкай на інфармацыю Еўрапейскай камісіі.

«З канца кастрычніка 2019 года не будзе больш сезоннага змянення часу», — заявіла на прэс-канферэнцыі еўракамісар Віялета Булк.

Праведзенае ў ЕС апытанне сярод 4,6 млн чалавек паказала, што 84 працэнты рэспандэнтаў выступаюць супраць сезоннага пераводу гадзіннікаў.

Еўрапарламент і нацыянальныя ўрады 28 краін — членаў блока павінны дасягнуць дамоўленасці наконт пераводу гадзіннікаў. «Альбо мы застанёмся ў летнім часе, альбо тыя краіны, якія вырашаць перайсці на зімовы час, апошні раз перавядуць гадзіннікі ў кастрычніку (2019 года)», — сказала Віялета Булк.

■ Надвор'е

БАБІНА ЛЕТА, МАЛАДОЕ...

Будзе прыпякаць да 28 градусаў

Вось ужо сапраўды другая палова верасня парадуе нас цяплом і сонцам. Увесь тыдзень днём пасля абеду ў нас будзе нават горача і ў асноўным без дажджоў, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

А галоўны ўплыў на наша надвор'е акажа антыцыклон з цэнтрам над Украінай. Будзе ў асноўным без ападкаў. У пачатку тыдня па начах будзе халаднавата, але ў сярэдзіне на тэрыторыю краіны пачне паступаць цёплае паветра з паўднёвага захаду Еўропы, усталюецца цёплае надвор'е.

У сераду ападкі не прагназуюцца наогул. У начныя і ранішнія гадзіны месцамі па краіне чакаецца слабы туман. Праўда, тэмпература паветра ўначы складзе ўсяго ад плюс 5 да плюс 12 градусаў, аднак днём значна пацяплее і будзе 21—27 градусаў вышэй за нуль. І ў чацвер будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 7—14 градусаў, удзень — ад плюс 21 градуса да 28 цяпла.

Таксама цёпла і суха будзе ў пятніцу. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, у асобных раёнах па поўдні краіны — плюс 5—7 градусаў. Удзень будзе ад 22 да 28 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя дні надвор'е пагоршыцца, чакаюцца дажджы і пахаладае. Восень, усё ж такі восень.

Сяргей КУРКАЧ

■

ЗОРНЫ АДНАКЛАСНІК

Пётр Клімук разам з расійскімі касманаўтамі наведаў Тамашоўку Брэсцкага раёна

Тамашоўка не раз сустракала гасцей-касманаўтаў дзякуючы свайму знакамітаму земляку. Вось і ў мінулую суботу Пётр Ільіч прывёз на малую радзіму прадстаўнікоў XXXI Міжнароднага кангрэса ўдзельнікаў касмічных палётаў, Герояў Расіі Аляксандра Самакуцяева і Сяргея Аўдзеева.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Традыцыйна сустрэча была цёплая. Як заўсёды, зайшлі ў школу, дзе знаходзіцца музей касманаўтыкі. А яшчэ гэтым разам падпісалі дагавор аб супрацоўніцтве паміж Брэсцкім раёнам і Зорным гарадком. Ініцыятарам дамовы стаў двойчы Герой Савецкага Саюза Пётр Клімук. У дакуменце ёсць шмат пунктаў, адзін з іх прадугледжвае партнёрства школ, гэта значыць, вучні будуць абменьвацца візітамі: нашы дзеці змогуць наведваць Маскву, а масквічы знаёміцца з Брэстчынай.

Ну і вядома, самыя лепшыя, самыя незабыўныя сустрэчы адбыліся з землякамі. Пабачыцца з Пятром Клімуком прыйшлі тры яго аднакласніцы.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

■ Здарэнні

«МАЗДА» Ў ПАДЗЕМНЫМ ПЕРАХОДЗЕ

Легкавы аўтамабіль «Мазда» каля поўначы суботы ўляцеў у падземны пераход на станцыі метро «Акадэмія навук» у Мінску.

Па інфармацыі ГУУС Мінгарвыканкама, кіроўца 1971 года нараджэння рухаўся па праспекце Незалежнасці з боку плошчы Калініна ў напрамку вуліцы Акадэмічнай. Пры праездзе скрыжавання з вуліцай Сурганава на забараняльны сігнал святлафора сутыкнуўся з аўтамабілем «Лада Веста», які рухаўся на дазваляльны сігнал святлафора па вуліцы Сурганава ў напрамку вуліцы К. Чорнага. У выніку сутыкнення «Мазда» вылецела на тратуар і скацілася ў падземны пераход станцыі метро «Акадэмія навук». На шчасце, у ДТЗ ніхто не пацярпеў.

Высветлілася, што мужчына за рулём «Мазды» не меў пасведчання кіроўцы і знаходзіўся ў стане алкагольнага ап'янення. Было ўстаноўлена, што раней ён неаднаразова прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за маёмасныя злачынствы. Грамадзянін быў затрыманы і дастаўлены ў Савецкае РУУС. У дачыненні да яго складзены адміністрацыйныя пратаколы, праводзіцца праверка.

ЦЯГНІКІ СПЫНІЛІ ЛОСЬ І ПАДАЗРОНАЯ СКРЫНЯ

Прыбыццё цягніка Мінск—Масква ў расійскую сталіцу было затрымана ўчора ранкам амаль на чатыры гадзіны. Прычынай таму стаў... лось.

На перагоне Мажайск—Дорахава ў 4.07 састаў здзейсніў наезд на гэтую жывёлу. Пасля выпраўлення тэхнічных непаладак, выкліканых сутыкненнем з дзікім зверам, цягнік праследаваў далей у Маскву, куды прыбыў каля 9.25. Затрымка, па інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, склала 3 гадзіны 50 хвілін.

А пасажыраў цягніка Мінск—Вільнюс, які выехаў з беларускай сталіцы ў 7.25, высадзілі на станцыі Гудагай з-за выяўлення падазронай скрынкі.

У Гудагай цягнік прыбыў у 9:32, на станцыю прыбыла спецыяльная група размініравання, ратавальнікі і хуткая дапамога. Падазроную скрынку вывезлі. Пасажыраў, якія спяшаліся, на аўтобусе пагранслужбы адвезлі на аўтамабільны памежны пераход.

На станцыі Гудагай пасажыры правялі больш за дзве з паловай гадзіны, затым ім дазволілі вярнуцца ў цягнік. Па інфармацыі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта, выбуховае прыстасаванне ў скрынцы не выявілі.

НЕ ТЫМ ТЫ ДЗЯЎЧЫНУ «ЧАСТАВАЎ»...

У Мінскім раёне хлопец схіліў дзяўчыну-падлетка паспытаць псіхатроп, цяпер яму пагражае да 10 гадоў турмы.

У сталічнае РУУС паступіла паведамленне з Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы аб тым, што да іх трапіла 16-гадовая жыхарка Стоўбцаў з прыкметамі наркатычнай перадазіроўкі. Супрацоўнікі аддзела па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Мінскага РУУС устанавілі, што дзяўчына разам з 18-гадовым прыяцелем выехала ў лес недалёка ад вёскі Каралёў Стан Мінскага раёна, дзе была зроблена схованка з псіхатропам. Забраўшы закладку, малады чалавек угаварыў спадарожніцу паспытаць асабліва небяспечнае псіхатропнае рэчыва — альфа-PVP. Пасля ўжывання дзяўчына адчула сябе дрэнна, знаёмы спалохаўся і збег. Жыхары вёскі Каралёў Стан, заўважыўшы падлетка ў неадэкватным стане, выклікалі хуткую. У дачыненні да маладога чалавека заведзена крымінальная справа за схіленне да ўжывання наркатычных рэчываў, псіхатропных рэчываў або іх аналагаў. Яму можа пагражаць пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам ад 3 да 10 гадоў.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

КНІГА КНІГ І ТЫЯ, ШТО З ЁЙ

У Мінск прыедуць «Іліяда» на папірусе і найстаражытнейшыя фрагменты Бібліі

Пра сапраўды ўнікальную выстаўку «Беларусь і Біблія», якая адкрыецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ўжо ў гэты чацвер, я даведалася з паведамлення на старонцы ў сацыяльных сетках. «Калі шчыра, я дагэтуль не магу паверыць, што ў Беларусь трапяць каштоўнасці такога ўзроўню! Рарытэтаў такой значнасці ў нас яшчэ ніколі не было!» — захоплена дзяліўся намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі па навуковай рабоце Алесь СУША. Спадар Алесь, які мае да арганізацыі выстаўкі самае непасрэднае дачыненне, паведаміў, што экспазіцыя абяцае быць сапраўды ўнікальнай — упершыню за ўсю нашу гісторыю ў межах адной выстаўкі ў Беларусь трапяць рарытэты сусветнай значнасці, узрост якіх дасягае 5 тысяч гадоў. Іх прывязуць з усяго свету — з музеяў, са шматлікіх прыватных калекцый. У адным месцы можна будзе пабачыць напісаныя 5-4 тысячы гадоў таму назад клінапісам на гліняных таблічках тэксты з Ура — радзімы Аўраама; арыгінальны рукапіс «біблії Антычнасці» — «Іліяды» Гамера, унікальныя скруткі з Мёртвага мора (кумранскія рукапісы), якім больш за 2 тысячы гадоў, і якія захавалі нам самыя раннія тэксты большасці кніг Старога Запавету; самыя старажытныя фрагменты Новага Запавету (II—III стст. н. э.); біблейскія рукапісы на старажытных мовах; першадрукі многіх народаў і краін, першыя пераклады Бібліі на нацыянальныя мовы; арыгіналы Біблій Гутэнберга, Лютэра і Скарыны; амаль усе пераклады Бібліі на беларускую мову; арыгіналы гравюр Альбрэхта Дзюрэра, Сальвадора Далі і іншых знакамітых мастакоў, зробленыя на біблейскія сюжэты...

Апошнія дні перад адкрыццём самыя адказныя для арганізатараў. Але спадар Суша знайшоў у сваім напружаным графіку час, каб адказаць на пытанні «Звязды», бо хацелася ж даведацца не толькі пра тое, што будзе на выстаўцы...

— Спадар Алесь, выстаўка называецца «Беларусь і Біблія». Але скептык спытае: якое дачыненне да Бібліі (ужо не кажучы пра Беларусь) маюць гліняныя таблічкі або «Іліяда»?

— Так, сапраўды, на выстаўцы «Беларусь і Біблія», якую мы плануем адкрыць 20 верасня, будуць прадстаўлены не толькі ўнікальныя і старажытныя тэксты Бібліі. Справа ў тым, што сама Біблія — гэта незвычайная кніга. Гэта самы капіяваны рукапіс і найбольш часта апублікаваная кніга ўсіх часоў. З перыяду да ўзнікнення кнігадрукавання ў Еўропе захавалася больш за 40 000 рукапісных копій Бібліі, а пасля таго было надрукавана больш за 6 мільярдаў асобнікаў Бібліі. Да таго ж Біблія лічыцца найбольш перакладаемай на розныя мовы кнігай: Біблія або яе часткі перакладзены на 3223 мовы.

Таму Біблію іначай яшчэ называюць «Кнігай Кніг». І хоць яна налічвае ўжо стагоддзі гісторыі, тым не менш у яе былі папярэднікі. Біблія не ўзнікла на роўным месцы. Больш раннія тэксты ўліліся ў біблейскую традыцыю, дапоўнілі яе, а старажытныя рэлігіі і вераванні паўплывалі на характар іўдаізму і хрысціянства — рэлігій, заснаваных на біблейскім вучэнні.

Менавіта таму мы вырашылі паказаць на выстаўцы і перадгісторыю Бібліі. Гэта будзе невялікая колькасць, але вельмі важных экспанатаў. Сярод іх — адна піктаграфічная і дзве клінапісныя гліняныя таблічкі, якія датуюцца 3000—2000 гадамі да нашай эры. Яны паходзяць з Ура ў Месапатаміі. Як лічыцца, менавіта там з'явіліся першыя помнікі пісьменства. Там людзі навучыліся занатоўваць інфармацыю, што зрабіла першую інфармацыйную рэвалюцыю: з таго часу веды пачалі назапашвацца і ўжо не абмяжоўваліся індывідуальным досведам асобных людзей. Што важна, менавіта ў гэтым горадзе жыў адзін з галоўных персанажаў Бібліі — Аўраам.

Вялікі ўплыў на Біблію аказала інтэлектуальная і духоўная традыцыя Старажытнай Грэцыі. Таму на выстаўцы будзе прадстаўлены адзін з самых важных твораў старажытнагрэчаскай літаратуры — «Іліяда» Гамера. Яна зрабіла такі моцны ўплыў на культуру Міжземнамор'я, што яе нават называюць «Бібліяй» класічнага свету. На выстаўцы можна будзе ўпершыню ў Беларусі пабачыць адзін са старажытных спісаў гэтага знакамітага твора. Гэты папірусны дакумент датуецца першым стагоддзем нашай эры — часам Новага Запавету.

— Не буду пытацца, як удалося сабраць гэтыя і іншыя рарытэты з усяго свету пад дахам Нацыянальнай бібліятэкі, бо несумненна: работа праведзена проста тытанічная. Як увогуле нарадзілася ідэя прывезці такую выстаўку ў Беларусь? Ці не ёсць гэта адгалоскі 500-годдзя нашага кнігадрукавання?

— У вас абсалютна правільнае прадчуванне: мінулагодняе святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання мае самае непасрэднае дачыненне да правядзення гэтай выстаўкі. Як памятаеце, Нацыянальная бібліятэка Беларусі летась рэалізавала вельмі шмат цікавых ініцыятыў: факсімільнае выданне, навуковыя і папулярныя публікацыі, міжнародныя і рэспубліканскія канферэнцыі, выстаўкі, конкурсы, прэзентацыі і шмат іншага. Такое шырокае святкаванне юбілею стала прычынай знаёмства з многімі міжнароднымі праграмамі і праектамі. Роўна год таму ў пачатку восені 2017 года да нас з прапановай аб сумеснай рабоце звярнулася кіраўніцтва і спецыялісты Міжнароднай недзяржаўнай ініцыятывы, якая называецца «Групай даследавання рукапісаў». І вось на працягу года мы кантактавалі, перыядычна сустракаліся, абмяркоўвалі дэталі, планавалі гэтую выстаўку, у дэталях звяралі, што і як павінна быць. Спачатку нават не верылася, што такое можа адбыцца ў Беларусі (прызнаюся, што і дагэтуль не да канца веру). Але вось нарэшце мы падышлі да таго дня, калі выстаўку могуць пабачыць тысячы беларусаў.

— Напэўна, у спіс тых, хто дапамагаў дамовіцца з уласнікамі і сабраць экспанаты, першым нумарам варта паставіць Скарыну і яго папярэднікаў і паслядоўнікаў... Не ў кожнай нават еўрапейскай краіне сталася б магчымай такая выстаўка...

— У нейкім сэнсе так. Назва «Беларусь і Біблія» адназначна звязвае нас з родным краем. Сапраўды, беларускія біблейскія помнікі зоймуць на выстаўцы пачэснае месца. І многія з тых помнікаў цесна звязаны з імёнамі беларускіх асветнікаў. Як вядома, з перапісваннем кніг Бібліі і стварэннем на іх аснове ўласных твораў звязаны імёны знакамітых беларускіх асветнікаў XII стагоддзя — Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. У далейшым гэта традыцыя працягвала развівацца ў кантэксце поліканфесійнай сітуацыі ў беларускай культуры. Біблейскія тэксты перапісваліся прадстаўнікамі духавенства і вернікамі рознага веравызнання: праваслаўнымі, каталікамі, уніятамі, пратэстантамі, стараверамі, іўдзеямі, мусульманамі. Разнастайнасць гэтых помнікаў сведчыць пра багацце духоўнага жыцця даўняй Беларусі.

Вынаходства кнігадрукавання адкрыла новую эпоху ў культурным развіцці нашага народа. Сімвалічна, што беларускае кнігадрукаванне пачалося з выпуску Францыскам Скарынам кніг Бібліі. Ужо пасля эпохі Францыска Скарыны на беларускіх землях былі заснаваны дзясяткі новых друкарняў, якія ствараліся не толькі ў буйных гарадах, але і ў невялікіх мястэчках ды прыватных маёнтках. У XVI—XVIII стагоддзях друкарскія варштаты працавалі ў Вільні, Заблудаве, Брэсце, Нясвіжы, Заслаўі, Лоску, Любчы, Мураванай Ашмянцы, Еўі, Слуцку, Куцейне, Буйнічах, Магілёве, Полацку, Супраслі і інш. І Святое Пісанне займала выключную ролю ў іх рэпертуары. Варта толькі згадаць, што першая друкарня на тэрыторыі сучаснай Беларусі — Берасцейская друкарня — праславілася менавіта дзякуючы выданню так званай Радзівілаўскай Бібліі. Можна згадаць таксама, што большасць з вядомых беларускіх асветнікаў і друкароў XVI стагоддзя так ці іначай звярталіся да выдання кніг Бібліі — і Сымон Будны, і Васіль Цяпінскі, і Пётр Мсціславец, і браты Мамонічы...

Таму можна ўпэўнена казаць, што кніжная культура Беларусі непарыўна звязана з гісторыяй пашырэння Бібліі на нашай зямлі.

Што ж да краін, то сапраўды падобных выставак ва Усходняй Еўропе я не памятаю. Наогул, унікальнасць выстаўкі палягае якраз у тым, што яна мае міжнародны характар: экспанаты ў Беларусь прывезены з Вялікабрытаніі, ЗША, Ізраіля, Карэі, са шматлікіх прыватных калекцый па ўсім свеце.

— Штосьці з фондаў уласна нашай Нацыянальнай бібліятэкі на выстаўцы будзе экспанавацца?

У межах выстаўкі, якая пройдзе з 20 верасня да 21 кастрычніка ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі, будзе працаваць рукапісная майстэрня, друкарскі варштат часоў Гутэнберга, пройдуць заняткі «Клуба кніжных прафесараў» для дзетак, а таксама навуковы лекторый ад знакамітых замежных і беларускіх даследчыкаў.

— Натуральна! Нацыянальная бібліятэка Беларусі з'яўляецца самай буйной бібліятэкай краіны і валодае найвялікшым зборам рукапісаў і старадрукаў у краіне. Таму, бясспрэчна, нам было што дадаць да многіх тэматычных раздзелаў выстаўкі. Гаворка ідзе і пра інкунабулы (першадрукі часоў Іагана Гутэнберга), і пра першыя пераклады Бібліі на нацыянальныя мовы, і пра знакамітыя выданні Святога Пісання, і пра цудоўна ілюстраваныя выданні розных часоў.

І, безумоўна, менавіта на фондах нашай бібліятэкі грунтуюцца раздзелы экспазіцыі, якія прэзентуюць беларускія біблійныя рукапісы, айчынныя Біблії-старадрукі і сучасныя пераклады Бібліі на беларускую мову.

Нам бы хацелася сказаць усім і кожнаму, што Беларусь мае багатую і разнастайную кніжную спадчыну і нам ёсць чым ганарыцца. Шматлікія каштоўнасці, як тыя ж выданні Францыска Скарыны, маюць не толькі нацыянальную, але і міжнародную значнасць.

— Які са старажытных экспанатаў найбольш уразіў асабіста вас?

— Калі шчыра, я даволі даўно вывучаю гісторыю кніжнай культуры, таму многае ведаю і нямала рознага бачыў. І ўсё ж для мяне многае на выстаўцы ўяўляе сабой выключную цікавасць. Напрыклад, мне не даводзілася раней бачыць арыгінальных старажытных рукапісаў «Іліяды» Гамера і «Баек» Эзопа, уражваюць старажытныя папірусы II—III стагоддзяў — часоў зараджэння хрысціянства, калі Біблія толькі пачала складвацца ў яе сучасным разуменні. Але найбольш мяне ўразілі старажытныя рукапісы Бібліі, пісаныя на розных мовах з розных куточкаў свету — копцкія, самарыцянскія, армянскія, арабскія, арамейскія, эфіопскія і іншыя. Вось гэта пабачыць разам — вялікая ўдача і вялікая радасць.

Наогул жа мяне не перастае радаваць і некалькі здзіўляць сам факт з'яўлення ў Беларусі такой колькасці настолькі каштоўных помнікаў, кожны з якіх мог бы стаць галоўным экспанатам на любой выстаўцы ці нават адзіным экспанатам — на выстаўцы адной кнігі.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

■ Святочнае

БУСЕЛ ПАЛЯЦЕЎ НА УРАЛ

Пакуль асобныя гамяльчане збіралі рэшткі ўраджаю з градак на дачах, абсалютная большасць гараджан у мінулыя выхадныя аддала перавагу святу і перамясцілася ў цэнтр горада над Сожам.

Гомель гучна і заўзята адзначаў сваё 876-годдзе. Адзінаццаты раз тут таксама праходзіў самы значны міжнародны танцавальны фестываль у краіне — «Сожскі карагод». У гэтыя тры дні можна было на іншых паглядзець і сябе паказаць на шматлікіх конкурсах і выстаўках, якія ладзіліся ва ўсіх кутках паўмільённага абласнога цэнтра. Дарэчы, было адчуванне, што насельніцтва Гомеля за гэтыя тры дні значна павялічылася. Ва ўсякім разе, яно сканцэнтравана выйшла на вуліцы, апрануўшы самыя лепшыя сукенкі і строі.

Харэаграфічнае мастацтва завалодала вуліцамі і стадыёнамі. На «Цэнтральным» падчас адкрыцця сцягі краін-удзельніц змянялі адзін аднаго — усяго іх гледачы налічылі 29. Паказаць сваё майстэрства ў розных жанрах прыехалі калектывы з Расіі, Украіны, Кітая, Малдовы, Ізраіля, Азербайджана, Польшчы, Казахстана... **Старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА** заўважыў, што Гомель невыпадкова абраны месцам правядзення такога буйнога культурнага форуму:

— Горад над Сожам мае даўнія харэаграфічныя традыцыі. Яшчэ ў 1946 годзе нашу рэспубліку ў Маскве прадстаўляў гомельскі ансамбль танца пад кіраўніцтвам народнага артыста БССР Аляксандра Рыбальчанкі. І сёння, праз дзесяцігоддзі, мы захоўваем і развіваем багатыя традыцыі, закладзеныя папярэднікамі. За 21 год існавання «Сожскі карагод» ужо стаў візітнай карткай культурнага жыцця Гомеля. За гэты час у ім прынялі ўдзел сотні калектываў з больш як 20 краін свету. Мы не толькі сустракаем старых сяброў, але і пашыраем яго межы.

Сёлета гамяльчане сталі гледачамі выступленняў славутых калектываў: Дзяржаўнага ансамбля танца Беларусі, Нацыянальнага

Цырымонія адкрыцця міжнароднага фестывалю харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод».

акадэмічнага народнага хору імя Г. Цітовіча, Нацыянальнага акадэмічнага ўкраінскага народнага хору імя Р. Вяроўкі, ансамбля «Песняры», вядучых салістаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі...

Амаль дзве тысячы навучэнцаў з розных устаноў Гомеля паказалі сваё майстэрства ў незвычайных практыкаваннях па адмысловым перасоўванні на прасторы футбольнага поля стадыёна «Цэнтральны». Затое ў гледачоў на трыбунах склалася ўражанне, што яны бачаць выяву вялізарнага бусла, які імкліва рухаецца скрозь час у фестывальную будучыню наступных карагодаў.

Знайшоўся час у межах свята для таго, каб сур'ёзна пагутарыць на тэмы агульных стасункаў не толькі ў галіне культуры. Дэлегацыі з 17 гарадоў-пабрацімаў Гомеля ўзялі ўдзел у палітычным «карагодзе». Падчас афіцыйнага прыёму гасцей старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр Кірычэнка падкрэсліў, што апошнім часам значна ўмацаваўся міжнародны статус горада:

— Гомель — актыўны ўдзельнік руху пародненых гарадоў. У межах партнёрскіх пабрацімскіх стасункаў наладжаны кантакт з 32 гарадамі. Мы праводзім сумесныя спартыўныя мерапрыемствы, супрацоўнічаем у адукацыйнай сферы, гандлі і вытворчай кааперацыі.

Тым часам падведзены вынікі міжнароднага творчага фестывалю, які сабраў больш за паўтары тысячы ўдзельнікаў і гасцей. Гран-пры «Сожскага карагода» — статуэтка бусла, які танцуе, выраблена

Салют у дзень Гомеля.

з выкарыстаннем золата і серабра, сёлета адляцела ў расійскі цэнтр чорнай металургіі Магнітагорск Чалябінскай вобласці. Галоўны прыз фестывалю заваяваў калектыў узорнай студыі «Дзеці Магніткі». **Старшыня журы, прафесар, загадчыца кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Святлана ГУТКОЎСКАЯ** падкрэсліла, што думка судзейскай калегіі была аднадушнай:

— Па-першае, з самага пачатку выступлення калектыў студыі «Дзеці Магніткі» заразіў нас энергетыкай, якая сыходзіла ад выканаўцаў. Па-другое, у намінацыях эстрадны танец і сучасны танец яны прадставілі вельмі цікавыя з балетмайстарскага пункту гледжання нумары. У кожным іх выступленні склалася ўсё: сапраўды падабраны выразныя сродкі, створана і раскрыта мастацкая выява, плюс вельмі эмацыянальнае зачаравальнае выкананне.

Застаецца дадаць, што ў 2020 годзе Гомель наступны раз будзе танцаваць у міжнародным карагодзе.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота Алега ЧВАРКОВА

САПРАЎДНАЕ І ПРЫВІДНАЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Многія тэатры гэтага фэсту заслугоўваюць, згадкі. У тым ліку і тэатры аднаго акцёра. Монаспектакляў было гэтым разам некалькі. Містар Піп Утан з Вялікабрытаніі прывёз спектакль пра Маргарэт Тэтчар. Вядомы брытанскі драматург і акцёр два гады таму паказваў на «Вежы» сваю работу «Чаплін». І тады ён атрымаў узнагароду як найлепшы акцёр. Яго цудоўнае ўменне пераўвасаблення дазваляе аднолькава паспяхова прадстаўляць Хемінгуэя, Чапліна, Гітлера. Ніхто і не здзівіўся таму, што містар Піп можа сыграць жанчыну, лэдзі Маргарэт. І гэта яму ўдалося.

Але крыху больш падрабязна хачу сказаць пра спектакль «Пікавая дама» Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Яўгена Вахтангава з Масквы. Насамрэч гэта монаспектакль народнага артыста РФ Яўгена Князева. Думаю, што многія ішлі на яго, бо ведаюць па кіно як выканаўцу ролі Вольфа Месінга. Таму, некаторыя былі трохі расчараваныя. Хацелася сказаць ім: «Гэта ж Пушкін, панове! Вы прыйшлі на твор Пушкіна». Нам давалі класіку без усялякіх пераносаў на цяперашні час, як, напрыклад, у спектаклях «Рэвізор» альбо ў брэсцкіх «Нявольніцах» па Астроўскаму. Акцёр стаіць на сцэне і чытае Пушкіна, у яго з дэкарацый — столік, акуляры, пенснэ ды званок, ну і, вядома, карты. Сам акцёр прызнаўся, што гэты спектакль у Маскве на роднай сцэне выглядае больш дынамічна і цікава. Там прысутнічаюць манекены астатніх герояў, і выканаўца перыядычна звяртаецца да іх. А тут ён іграў усіх ды яшчэ і аўтара. Калі мы апошні раз чыталі Пушкіна? Не вершы, а містычную «Пікавую даму»? Вось і я пра тое. Гэта аповед пра вечнае імкненне чалавека да багацця і нагода задумацца, ці варта ісці да сваёй мэты любой цаной. Тут ёсць і перасцярога тым, хто не ўмее берагчы атрыманае ў спадчыну. А яшчэ разважанні пра старасць, якой цяжкай яна бывае нягледзячы на бесклопатную, вясёлую, прыгожую маладосць.

Цікава, што пасля спектакля Яўген Уладзіміравіч узяў мікрафон і звярнуўся да сваіх гледачоў. Расказаў, што ў гэты дзень пачынаецца сезон у яго Вахтангаўскім тэатры, але ён вырашыў прыехаць у Брэст, бо яго ўжо не раз запрашалі. І прыехаў літаральна на некалькі гадзін...

Фота Аляксандра ШУПЛЯКА.

Як мы заўсёды чакаем Ровенскі абласны акадэмічны ўкраінскі музычна-драматычны тэатр! І ніколі не расчараваліся. Вось і гэтым разам яны парадавалі — паказалі работу па п'есе ірландца Марціна Мак-Донаха «Калека з вострава Інішман». Восем гадоў таму гэту работу паказваў аўтарскі тэатр з Пермі «Каля моста». Тады пермякі зрабілі фурор на «Вежы» і забралі Гран-пры. І было крыху страшнавата, як жа ровенцы справяцца са складаным матэрыялам, тым больш пастаноўка зроблена на ўкраінскай мове. Але ўсе ўсё разумелі. Гэта шчымлівая гісторыя з жыцця вострава Інішман — аднаго з самых загадкавых месцаў Ірландыі. На маленькім востраве з суровым кліматам жывуць людзі, жыццё якіх такое ж беднае на падзеі, як мясцовая прырода. І самы незайздросны лёс у хлопца Білі, які з дзяцінства пакутуе на ДЦП. Ён з цяжкасцю ходзіць, але шмат чытае, мае добрае сэрца і чулую душу. Толькі ўсе яго завуць калекам, што прычыняе яму дадатковыя пакуты. Існаванне жыхароў вострава, якое не мяняецца гадамі, літаральна выбухае, калі сюды прыязджае здымачная група з Галівуда. Усе хочуць трапіць у будучы фільм, але атрымліваецца гэта толькі ў калекі Білі. Ён дабіваецца сваёй мэты неверагоднымі намаганнямі, ён марыць вырвацца ў вялікі прыгожы свет... Але праз некаторы час Білі вяртаецца, бо там, у Галівудзе, пасля проб ён аказваецца нікому не патрэбны. І пасля вяртання ён высветліў галоўную таямніцу жыцця: хто яго бацькі і чаму яны памерлі. Аказалася, што бяспутныя яго бацькі выратавалі, і дзіця ўзялі з сабою. Каб выратаваць малога, адзін з мясцовых жыхароў Джоніпацінмайк кінуўся ў мора і выцягнуў яго. Потым украў грошы ў сваёй нябеднай алкагалічкі маці і аплаціў лячэнне сіраты. А цёткі Білі аказаліся зусім чужымі людзьмі — яны пашкадавалі і выхавалі калеку, а яшчэ палюбілі яго... Гэта быў спектакль, які прымусіў смяяцца і плакаць, думаць і перажываць. У тым ліку і пра адносіны грамадства да людзей з абмежаванымі магчымасцямі...

Закрыццё фэсту, як і яго адкрыццё, парадавала. П'еса Брэсцкага тэатра драмы «Нявольніцы» ў пастаноўцы маладога маскоўскага рэжысёра Ягора Равінскага стала жыццесцвярджальным акордам. Дзея з XIX стагоддзя перанесена ў нашы дні. Стары алігарх жэніцца з маладзенькай прыгажуняй. І пачынаюцца... падазрэнні, здрады, пакуты. Яна, закаханая ў маладога, кідаецца яму на шыю, каб запоўніць пустэчу сваёй душы, якая саспела для кахання. Потым усё аказваецца не так, як намарылася, і каханы зусім не герой, а муж, наадварот, добры і высакародны чалавек. Усё становіцца на свае месцы. І маладая жонка аказваецца не такой ужо дурніцай — яна пачынае адрозніваць сапраўднае ад прывіднага.

* * *

Наступная «Белая вежа», прымеркаваная да 1000-гадовага юбілею Брэста, пройдзе з удзелам гарадоў-пабрацімаў. Пра гэта аб'явіў яшчэ на адкрыцці старшыня аргкамітэта фестывалю, старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

З КАРАЛЕЎСКІМ РАЗМАХАМ

Старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта Мечыслаў ГОЙ піша пажаданні гораду Гродна.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гродзенская зямля вядома і сваёй прыгажосцю. Юбілей горада — важкая нагода, каб успомніць багатую гісторыю Гродна, якая між тым пішацца дзень за днём.

З гістарычнага праменаду пачаліся і святочныя мерапрыемствы. На пляцоўцы гродзенскага архіварыуса — ахоўніка сімвалічнага скрутка — пакінуў свой запіс губернатар Уладзімір Краўцоў. Адразу пасля гэтага гараднічы запрасіў усіх на імправізаваную экскурсію, дзе можна было ўбачыць урок музыкі на балконе, рыцарскі паядынак і нават пачуць серэнады старажытнага ідальга сваёй даме сэрца. Такія імерсіўныя спектаклі без пачатку і канца папулярныя ў Еўропе, а ў Гродне і ў Беларусі арганізаваны ўпершыню. На працягу дня на цэнтральнай вуліцы Гродна можна было ўбачыць цікавыя сцэны з жыцця горада і апынуцца ў атмасферы далёкага мінулага. Многія гараджане і госці горада міжволі станавіліся ўдзельнікамі гэтага імерсіўнага спектакля, што спрыяла настрою і адчуванню свята. На такі лад былі накіраваны ўсе мерапрыемствы маштабнага дзеяння.

Дарэчы, горад напярэдадні свята атрымаў некалькі важкіх падарункаў. У новым мікрараёне Альшанка адкрылі дзіцячы садок на 230 месцаў. Гэта ўжо чацвёртая такая ўстанова ў маладым мікрараёне, які зараз дынамічна развіваецца. У гэты ж дзень тут урачыста быў адкрыты міні-рынак.

Яшчэ адзін падарунак атрымалі прыёмныя бацькі, якія выхоўваюць васьмярых дзяцей. Для іх у дзень горада быў адкрыты дом сямейнага тыпу. Ён пабудаваны побач з двума іншымі такімі ж аб'ектамі, а вуліца ўжо атрымала неафіцыйную назву «бацькоўскай».

Між тым вуліца Савецкая падчас свята стала алеяй знакамітасцяў. Тут можна было сустрэць нямала вядомых артыстаў, у тым ліку ўдзельнікаў Еўрабачання, музыкантаў, пісьменнікаў. Цэнтр горада стаў тэатральнай пляцоўкай з дзясяткамі зон. Тут размясціліся і кніжны фестываль, і спартыўны гарадок, і сырная пляцоўка. Сырны фестываль у дзень горада стаў ужо традыцыйным. Удзел у ім прымаюць сыраробы з усёй краіны. Арганізатары і гэтым разам змаглі здзівіць — ганаровым госцем стаў касманаўт Алег Навіцкі. Адбылася дэгустацыя новага гатунку сыру, які атрымаў назву ў гонар каралеўскага горада — «ГарадзенЬ».

Новыя зоркі зазіхацелі на кіналеі, дзе ўладкаваны пліты з назвамі кінафільмаў, якія тут здымалі. Падчас свята адкрылі яшчэ дзве — у гонар фільма «Мяне завуць Арлекіна» і «Кааператыў Палітбюро». І гэта яшчэ не ўсе «навінкі» архітэктуры. На цэнтральнай плошчы з'явіўся 200-кілаграмовы металічны глобус з назвай гарадоў-пабрацімаў Гродна. Арт-аб'ект можа стаць яшчэ адной фотазонай горада. Глобус устанавілі побач з «квітнеючым» сонечным гадзіннікам.

Святочным арт-аб'ектам можна назваць і незвычайны каравай, складзены з дзясятка апетытных караваяў. Прыгожыя вырабы падараваны гасцям свята, якія прыбылі з суседніх краін і гарадоў-пабрацімаў.

Дарэчы, у дзень свята плошча Леніна ператварылася ў гіганцкую кухню. Мала хто прайшоў міма гастранамічнага фестывалю «Гарадзенскія прысмакі». Тут можна было адчуць сапраўднае Сярэднявечча — у цэнтры горада смажылася парася на ражне. Многія вырабы былі пазначаны юбілейнай датай — 890.

Цікавым штрыхом свята можна назваць выступленне гродзенскага атлета Аляксандра Кодзіса, які працягнуў цераз плошчу 12-тонны тралейбус з малымі пасажырамі. Усе прысутныя горача падтрымалі сілача. А ў гэты час адбыўся і яшчэ адзін цікавы факт. Каля новай статуі турыста ў цэнтры горада сустрэлі 60-тысячнага госця, ім аказаўся грамадзянін Нарвегіі. Ён выказаў задавальненне, што трапіў на такое прыгожае свята.

Вечарам адбылося вогненнае шоу ў Швейцарскай даліне. Тэатр агню прадставіў новую праграму, якая доўжылася 15 хвілін. Фіналам выступлення стаў вогненны надпіс «Гродна 890 гадоў». Цёпла сустрэлі гродзенцы беларускіх артыстаў — Алену Ланскую, Руслана Аляхно, будучага ўдзельніка дзіцячага Еўрабачання Даніэля Ястрэмскага. А фіналам свята стаў працяглы феерверк, які расквеціў неба над горадам бліскучымі каляровымі зоркамі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота БелТА.

■ На свае вочы

І СЛІМАК ДЛЯ АЗДАРАЎЛЕННЯ

На XI спецыялізаванай выстаўцы-кірмашы «Віцебшчына — за здаровы лад жыцця» было чаму здзіўляцца.

Напрыклад, наведвальнікі ў чаргу выстройваліся, каб ацаніць стан здароўя за некалькі хвілін з выкарыстаннем камп'ютарнай праграмы, распрацаванай для касманаўтаў. Напэўна, інтарэс «падагрэў» нядаўні мінскі касмічны форум.

Вытворцы ж прадставілі свае прадукты харчавання — не толькі смачныя, але і карысныя для здароўя. (Рэцэптура ўсё часцей узгадняецца з медыкамі.) Сярод прадпрыемстваў была заўважана інтэграцыйная аграрная структура — ААТ «Віцебскі мясакамбінат». Пра стварэнне холдынгаў сельскагаспадарчай накіраванасці на Віцебшчыне апошнім часам многае гавораць і пішуць у СМІ. Акрамя згаданага прадпрыемства, у холдынгу — гарадоцкая птушкафабрыка, віцебскі камбінат хлебапрадуктаў і лепельскі малочны. Асартымент прадукцыі багаты: каўбасныя вырабы, пельмені, яйкі курыныя ды перапялінья, мяса індычкі, смятана і іншая «малочка», у тым ліку і марожанае...

Між тым, каля канцэртнай залы «Віцебск» падчас правядзення кірмашу запрашалі на «Вуліцу здароўя». Там рэкламавалі фітнес, армрэслінг, вулічны баскетбол, скандынаўскую хадзьбу, гіравы і іншыя віды фізкультуры і спорту. Майстар-класы паказалі спартыўныя клубы для дзяцей і падлеткаў і, што ўжо ў наш час стала нормай, пенсіянераў.

Сярод тых, хто павіншаваў удзельнікаў і гасцей, быў і **начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрый ДЗЕРКАЧ,** які сказаў, што выстаўка спецыяльна праводзіцца столькі гадоў, каб навучыць усіх ахвотных захоўваць здароўе.

Дарэчы, сярод ганаровых гасцей на выстаўцы прысутнічалі і знакамітыя спартсмены. У прыватнасці, **Ігар КАНЫГІН, барэц класічнага (грэка-рымскага) стылю, двойчы чэмпіён свету, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Еўропы і СССР,** які пажадаў юным землякам весці здаровы лад жыцця і быць актыўнымі не толькі на спартыўных пляцоўках.

Навінкі ў дыягностыцы і лячэнні — традыцыя кірмашу. Сёлета, у прыватнасці, усе ахвотныя змаглі праверыць амалоджвальны эфект ад заморскага слімака, які, поўзаючы па целе, робіць скуру гладкай, «як у дзіцяці»... Па-ранейшаму запатрабаванымі былі прапановы праверыць узровень цукру ў крыві, пракантраляваць артэрыяльны ціск, зрабіць кардыяграму.

Сотні наведвальнікаў узялі ўдзел у тэматычных віктарынах і гульнях.

Аляксандр ПУКШАНСКІ

■

Ці можна кіраваць попытам спажыўцоў?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Іншае пытанне — спосабы рэалізацыі праграмы лаяльнасці. Гэта можна зрабіць пры прад'яўленні пластыкавай карткі, альбо пры выкарыстанні электронных прылад, па якіх можна ідэнтыфікаваць пакупніка: мабільныя прылады, nfc пазнакі і іншае. Тут патрабуецца разуменне таго, як шмат людзей і як часта карыстаюцца гэтымі прыладамі і іх гатоўнасць выкарыстоўваць новаўвядзенні для атрымання прывілеяў.

Але беларускі пакупнік асабліва нічым не адрозніваецца ад еўрапейскага або амерыканскага пакупніка: усе ў асноўным шукаюць, дзе танней і лепш.

— Па вашай праграме лаяльнасці выпушчана больш за 900 000 актыўных картак. У чыіх руках яны, хто гэта?

— Карыстальнікамі праграмы лаяльнасці з'яўляюцца жанчыны ва ўзросце ад 25 да 50 гадоў. Гэта найбольш актыўная частка пакупнікоў, якія цікавяцца ўсім новым, што з'яўляецца ў праграме. Мужчыны больш стрыманыя, мабыць, давяраюць шопінг сваім другім палавінкам. Яны больш актыўныя ў пэўных сферах: АЗС, электроніка, кафэ і рэстараны.

У сваёй большасці трымальнікі разбіраюцца ва ўмовах праграмы лаяльнасці прадпрыемстваў і могуць ацаніць выгаду, якую яны атрымліваюць ад удзелу ў праграме. Са свайго боку мы паставілі мэту сабраць і падтрымліваць найлепшыя праграмы лаяльнасці беларускіх прадпрыемстваў, у купонах, за балы і ў спецыяльным клубе прывілеяў.

«Многія гандлёвыя прадпрыемствы спрабуюць злоўжыць даверам пакупнікоў, ведаючы, што яны адрэагуюць на заяўлены памер зніжкі, а не на цану тавару. Таму звычайнай была і застаецца часта практыка, калі прадпрыемства падымае цану і на гэта ж павышэнне аб'яўляе «супер зніжку».

Але ў той жа час варта адзначыць, што нашы айчынныя пакупнікі бываюць вельмі стрыманыя ў частцы прымянення сапраўды значных зніжак. У гэтым часцяком вінаватыя самі прадпрыемствы, якія культывуюць палітыку «псеўдараспродажаў», «ліквідацый калекцый» і «суперакцый», якія доўжацца гадамі. На гэтым фоне пакупнікі перастаюць верыць у любыя зніжкі і акцыі, якія сапраўды маюць каштоўнасць і створаны з вялікімі намаганнямі, каб даставіць максімальную выгаду менавіта пакупніку.

Наша праграма ставіць сваім прадпрыемствам-удзельнікам адну вельмі важную ўмову — даваць рэальныя зніжкі. І мы старанна сочым за цэнавай палітыкай кожнага нашага прадпрыемства-ўдзельніка і часцяком адмаўляемся працаваць з прадпрыемствамі з прычыны таго, што прапанаваная зніжка з'яўляецца нядобрасумленным увядзеннем у зман пакупніка.

— Якімі мэтамі кіруюцца праграмы лаяльнасці?

— Калі перад пакупніком узнікаюць некалькі дзвярэй магазінаў і ён вырашае, у якія з іх увайсці, то правільна выбудаваная праграма лаяльнасці

Алег ЗАХАРАЎ.

з'яўляецца ключом да дзвярэй прадпрыемства гандлю. Праграма лаяльнасці — гэта інструмент барацьбы за пакупніка, за яго ўвагу. Яна павінна выклікаць станоўчыя эмоцыі ў пакупніка, каб ён не толькі вярнуўся ў гэтае прадпрыемства, але і рэкамендаваў іншым людзям — сваім сваякам, калегам або знаёмым. І сам пакупнік адчыняў дзверы толькі гэтага прадпрыемства, а не канкурэнта.

Комплексная сістэма матывацыі кліента павінна быць пляцоўкай для прадпрыемства, якая дае магчымасць заявіць пра сябе шырокаму колу плацежаздольных кліентаў — трымальнікаў банкаўскіх плацежных картак. Пры гэтым усё роўна, дзе знаходзіцца трымальнік карткі — у сталіцы ці ў невялікім мястэчку. Банк заўсёды раскажа аб прадпрыемстве і дапаможа выбраць трымальніку карткі тое кола крамаў, якія яму патрэбныя. Гэта вельмі важная ўласцівасць сістэмы матывацыі або сістэмы мерапрыемстваў, бо наяўнасць самой праграмы лаяльнасці ў прадпрыемства яшчэ не з'яўляецца гарантыяй таго, што кліент ёй скарыстаецца. Тут трэба яшчэ расказаць пакупніку аб гэтай праграме, бо ён папросту можа не ведаць пра яе.

— Што праграмы лаяльнасці даюць спажыўцу?

— Большасць такіх праграм накіравана на атрыманне пакупніком прамой эканамічнай выгады ў выглядзе зніжкі. Але больш «прасунутыя» праграмы даюць магчымасць пакупніку адчуць сябе «абраным» у параўнанні з іншымі: напрыклад, першым скарыстацца пэўнымі прапановамі, атрымаць запрашальныя на закрытыя вечарынкі, атрымаць камплімент у выглядзе напою або дэсерту бясплатна і многае іншае.

— Якія існуюць спосабы рэалізацыі праграм лаяльнасці?

— Формаў і метадаў правядзення праграм велізарнае мноства і правільнае прымяненне іх на прадпрыемстве павінна прыводзіць да павелічэння колькасці продажаў і агульнай сумы. Найбольш папулярнымі формамі лаяльнасці для масавага кліента з'яўляюцца дысконтныя праграмы, якія можна падзяліць на дзве вялікія групы: зніжкавыя і бонусныя.

У рамках зніжкавай праграмы кліент атрымлівае зніжку «тут і цяпер», яна дазваляе кліенту сэканоміць адразу ў момант пакупкі. Напрыклад: прамая зніжка 5 % на суму чэка — вы замест 100 рублёў плаціце 95, а 5 рублёў застаецца ў вас у кішэні. Памер скідкі можа быць фіксаваны альбо залежаць ад якіх-небудзь умоў: ад сумы чэка або папярэдніх накапленняў у гэтым прадпрыемстве.

Бонусныя праграмы нашмат складанейшыя і прымушаюць пакупніка назапашваць балы, бонусы і абменьваць іх на зніжкі або пэўныя тавары ўжо пры здзяйсненні наступных пакупак.

Напрыклад, калі вы назапашваеце 10 балаў за кожныя 100 рублёў, то для назапашвання 100 балаў вам трэба выдаткаваць у краме 1000 рублёў. Прамой эканоміі, як правіла, у момант набыцця не ўзнікне — яна адкладаецца на потым, калі вы скарыстаецеся сваімі баламі ў якую-небудзь наступную куплю. Назапашаныя 100 балаў вы абмяняеце на зніжку ў 100 рублёў або на тавар коштам 100 рублёў. Гэтая сістэма выгадная для прадпрыемства, бо кліент у перыяд назапашвання плаціць поўны кошт тавару, і ёсць гарантыя таго, што ён прыйдзе другі раз, каб абмяняць назапашаныя балы на прывілей.

У сваю чаргу варта адзначыць, што кліенту хацелася б атрымаць максімальную выгаду ад удзелу ў праграме, а значыць мець магчымасць і эканоміць, і назапашваць, і яшчэ шмат чаго іншага.

— Якая праграма больш выгадная: дысконтная або бонусная?

— Для пакупніка больш выгадна атрымаць зніжку «тут і цяпер»: замест 100 рублёў заплаціць 95 і самому вырашаць, як скарыстацца сэканомленымі 5 рублямі. Для прадпрыемства больш выгадныя бонусныя праграмы: яны дазваляюць доўгі час атрымліваць поўны кошт тавару, падаючы пакупніку ілюзію атрыманай выгады ў выглядзе балаў. Наяўнасць балаў прымушае пакупніка зноў наведаць канкрэтны супермаркет, каб абмяняць балы на зніжку. Але вялікі працэнт пакупнікоў так і пакідае свае назапашаныя балы без выкарыстання — а гэта ўжо чыстая выгада прадпрыемства.

Таму мая рэкамендацыя: калі ёсць два аднолькавыя магазіны, то лепш хадзіць у той, які дае зніжку адразу, а не налічвае балы на адны і тыя ж тавары.

— Чаму ў нашым грамадстве сфарміравалася паняцце «зніжак па-беларуску»? І чаму нашы праграмы лаяльнасці часта абвінавачваюць у сквапнасці?

— Многія гандлёвыя прадпрыемствы спрабуюць злоўжыць даверам пакупнікоў, ведаючы, што яны адрэагуюць на заяўлены памер зніжкі, а не на цану тавару. Таму звычайнай была і застаецца часта практыка, калі прадпрыемства падымае цану і на гэта ж павышэнне аб'яўляе «супер зніжку». Многія пакупнікі, давяраючы прадпрыемству і яго рэкламе праз СМІ, успрымаюць гэта як выгадную прапанову і здзяйсняюць незапланаваныя пакупкі, не толькі не атрымліваючы якой-небудзь эканоміі, але часам нават пераплачваючы.

— Як вы думаеце, нашы людзі ўмеюць лічыць грошы? Яны могуць вызначыць, што ім сапраўды выгадна?

— Варта прызнаць, што прамое параўнанне цэн на тавары ў розных крамах мала хто робіць, памеры зніжак больш на слыху і якраз на іх людзі больш за ўсё звяртаюць увагу. Таму памеры зніжак з'яўляюцца асноўнымі арыенцірамі, а канчатковы кошт пралічвае параўнальна невялікі працэнт людзей. Высновы рабіце самі...

Сяргей КУРКАЧ.

ПРАДАВАЛІ АРАНДАВАНЫ ВЕЛАСІПЕД

У сталічную міліцыю звярнуўся індывідуальны прадпрымальнік, які займаецца пракатам веласіпедаў, прасіў дапамагчы яму вярнуць адну двухколавую машыну коштам 800 рублёў, якую арандатар адмаўляўся вяртаць.

Праваахоўнікі ўстанавілі, што два жыхары горада 26 і 29 гадоў заключылі здзелку паміж сабой: адзін узяў напракат веласіпед і... прадаў яго другому. Прычым, за 100 рублёў. Новы «гаспадар», у сваю чаргу, збыў яго на адным са сталічных рынкаў. Як паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска, «веласіпедыстам» за іх учынак, які на юрыдычнай мове называецца махлярствам, пагражае пакаранне ў выглядзе штрафу ці папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў, ці арышту, ці абмежавання волі на тэрмін да чатырох гадоў, ці пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОБЪЯВЛЕНИЕ № 1

Антикризисный управляющий – частное предприятие «Антикризистим» (г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. 8 029 3360872) в лице директора Шило Алексея Сергеевича извещает о проведении торгов в форме аукциона по продаже имущества частного инвестиционного унитарного предприятия «ФОНДО», расположенного по адресу: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 18А:

лот № 1: бытовые помещения с гаражом, инв. № 342/С-21163, общая площадь 82,2 кв. м, начальная цена – 2 100,00 бел. руб. без НДС;

лот № 2: сушильное отделение, инв. № 342/С-19964, общая площадь 72,4 кв. м, начальная цена – 2 000,00 бел. руб. без НДС;

лот № 3: столярный цех, инв. № 342/С-21162, общая площадь 432,2 кв. м, начальная цена – 11 800,00 бел. руб. без НДС;

лот № 4: котельная, инв. № 342/С-19963, общая площадь 89,5 кв. м, начальная цена – 2 600,00 бел. руб. без НДС;

лот № 5: деревообрабатывающий цех, инв. № 342/С-19962, общая площадь 2137,4 кв. м, начальная цена – 63 200,00 бел. руб. без НДС.

Торги состоятся 19 октября 2018 г. по адресу: г. Минск, ул. Б.Берута, 3Б, оф. 517.

Заявки принимаются **с 19 сентября 2018 г. с 09.00 до 18 октября 2018 до 17.00.**

Продавец – частное инвестиционное унитарное предприятие «ФОНДО».

Сумма задатка за участие в торгах – 5 % от начальной цены предмета торгов.

Местонахождение предмета торгов: Гомельская обл., г. Светлогорск, ул. Заводская, 18А.

Торги проводятся в форме аукциона, открытого по составу участников и по форме подачи предложений о цене.

Шаг торгов – 5 % от начальной цены предмета торгов. Для участия в торгах лицо, заявившее о своем участии в торгах, до даты торгов вносит задаток в счет обеспечения оплаты приобретаемого на торгах имущества в размере 5 процентов от начальной цены имущества должника, выставляемого на торги. Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким предметам торгов, вносит задаток в размере, установленном для предмета торгов с наибольшей начальной ценой.

До подачи заявки претенденту необходимо перечислить задаток в безналичном порядке по следующим платежным реквизитам: частное инвестиционное унитарное предприятие «ФОНДО», р/с BY77MTBK30120001093300066876, в ЗАО «МТБанк», код MTBKBY22, УНП 191023112.

Заявления на участие в аукционе с приложением платежного поручения, подтверждающего внесение задатка, а также: для юридических лиц – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, устава, документы, подтверждающие полномочия представителя; для индивидуального предпринимателя – заверенной копии свидетельства о гос. регистрации, копия паспорта; для физ. лица – копии паспорта принимаются по адресу: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517.

Срок возможного отказа от проведения торгов – **12.10.2018.** Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки. После окончания торгов в день проведения торгов с победителем подписывается протокол. Договор с победителем торгов заключается в течение 15 дней с даты проведения торгов и утверждения протокола о результатах торгов. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 10 дней после подписания протокола. Условия отгрузки – 100 % предоплата. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Получить полную информацию о порядке и условиях проведения торгов, о предмете торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Б. Берута, 3Б, оф. 517, тел. (017) 2150240, (029) 3360872. Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по предварительному согласованию с организатором торгов.

Центр Промышленной Оценки
• **Организация аукционов**
• **Оценка всех видов имущества**

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Копыльское районное потребительское общество, г. Копыль, пл. Ленина, 21

Предмет аукциона
Адрес: Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. 50 лет БССР, 1А/7

Наименование	Назначение	Общая площадь	Инвентарный номер
Автозаправочная станция	Здание специализированное автомобильного транспорта	21,6 кв. м	642/С-11557

Сведения о земельном участке: пл. **0,2756 га** предоставлен продавцу на праве аренды для содержания и обслуживания здания автозаправочной станции

Начальная цена с НДС 20 % – 9 305,00 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: 50 % от цены продажи имущества, с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачиваются в течение пяти календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается в течение месяца

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Аукцион состоится 22.10.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и **необходимые документы принимаются по 19.10.2018** до 17.00 по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by**

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»
г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129

Сообщает, что 1 октября 2018 г. в 11.00 в конференц-зале акционерного общества по адресу: 220123 г. Минск, ул. М. Богдановича,129 состоится внеочередное общее собрание акционеров с повесткой дня:

Об отмене ежемесячной доплаты к пенсии пенсионеру Амбражевичу Л. Т., ранее работавшему в ОАО «Белтрубопроводстрой».

Об отмене ежемесячной доплаты к пенсии пенсионеру Гайковичу И. А., ранее работавшему в ОАО «Белтрубопроводстрой». Об установлении выплаты материальной помощи Гайковичу И. А., ранее работавшему в ОАО «Белтрубопроводстрой».

Об отмене ежемесячной доплаты к пенсии пенсионеру Донцу А. П., ранее работавшему в ОАО «Белтрубопроводстрой». Об установлении выплаты материальной помощи Донцу А. П., ранее работавшему в ОАО «Белтрубопроводстрой».

Собрание проводится в очной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, 17 сентября 2018 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. М. Богдановича, 129 в рабочие дни с 24 сентября 2018 г.

Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Сведения по телефонам: 334-93-19, 334-33-83.

Совет директоров.

УНП 100364117

Свидетельство о государственной регистрации и печать **Общества с ограниченной ответственностью «ТРЭЙД-ДРЕВ»** в ЕГР регистрационный номер **101214653**, считать недействительными в связи с утерей.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 7 (35)

■ Экалагічны рэйд

НЕ ЗАКАПАЦЬ ПРЫБЫТАК

Як у Бабруйску вырашаецца праблема адходаў

Чыстыя і дагледжаныя вуліцы — першае, на што звяртаюць увагу госці Бабруйска. А шматлікія кантэйнеры для збору смецця, здаецца, гавораць пра тое, што ў гэтым горадзе і работа па абыходжанні з адходамі таксама вядзецца на высокім узроўні. Каб даведацца, ці так гэта, разам з галоўным спецыялістам Бабруйскай гаррайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Марынай АБРАМАВАЙ і начальнікам аддзела кантролю абыходжання з адходамі Магілёўскага абласнога камітэта ПРіАНА Андрэем СІДАРУКОМ накіроўваемся на мясцовыя палігоны.

Чалавечы фактар — самы важны

Першы ў нашым спісе — палігон цвёрдых камунальных адходаў «Бабіна» УКВП «Прамадходы» праектнай магутнасцю 1530 тысяч метраў кубічных. Гэты аб'ект працуе больш за 30 гадоў — усяго з пачатку эксплуатацыі тут захавана больш за 1603 тысячы тон адходаў, і сёння яму патрэбная замена. Пакуль ідуць перамовы паміж райвыканкамам і «Аператорам другасных матэрыяльных рэсурсаў» па магчымым будаўніцтве ў раёне смецце-перапрацоўчага завода, сюды звозяцца цвёрдыя камунальныя адходы ад насельніцтва і юрыдычных асоб.

Узровень выкарыстання адходаў: па Бабруйску — 19 %, па раёне — 14 %.

Па словах Марыны Абрамавай, праблемы ўзнікаюць са смеццем усіх гэтых катэгорый. Але калі з недапрацоўкамі юрыдычных асоб змагаюцца метадам штрафных санкцый, то адходы ад насельніцтва — вялікі галаўны боль інспектараў. Некаторыя бабруйчане да сёння кідаюць другасныя рэсурсы разам з іншым смеццем. Крыху палепшыць сітуацыю дапамагае лінія сартавання ААТ «Спецаўтапрадпрыемства», якая працуе на палігоне «Бабіна» з 2015 года і сартуе адходы з жылфонду. Так, за восем месяцаў 2018 года на палігоне захавана каля 38 тыс. тон камунальных адходаў ад насельніцтва і юрыдычных асоб. Пры гэтым на лінію сартавання паступіла больш за 8800 тон змяшаных адходаў, у якіх доля выбраных ДМР (на 12.09.2018) складае 6,8 %.

Перавозка адходаў без тэнта — распаўсюджанае правапарушэнне.

Майстар палігона «Бабіна» Андрэй ДЗЯЦЮК расказвае, што за дзень сюды заязджае каля 70 адзінак транспарту са смеццем. Вось і падчас нашага візіту трактары і смеццявозы амаль па чарзе перасякаюць межы палігона. Большасць з іх — тэхніка ААТ «Спецаўтапрадпрыемства», якая перавозіць змяшаныя адходы з жылфонду на лінію сартавання.

— Чаму ў вас адходы не накрытыя тэнтам? — гэта пытанне Андрэй Сідарук задае многім кіроўцам транспарту, якія заязджаюць на палігон. У адказ чуе амаль адно і тое ж: «пра правілы перавозкі (якія патрабуюць забяспечваць прадухіленне шкоднага ўздзеяння адходаў на навакольле. — Заўв. аўт.) ведаю, але ж... «баюся тэнт парваць», «тут ехаць недалёка», «гэтыя адходы не пыляць». У выніку кожны з такіх кіроўцаў атрымлівае павестку ў гаррайінспекцыю для размовы са спецыялістам наконт свайго парушэння.

На жаль ці на шчасце, падчас рэйду нам не ўдалося сустрэць тых, хто выгрузіў на палігон адходы з ДМР ці паспрабаваў гэта зрабіць. Але, па словах Марыны Абрамавай, такія выпадкі ўсё ж бываюць. Сёлета ў Бабруйскім раёне выяўлена 7 фактаў захавання ДМР і 6 спроб гэта зрабіць. Да адказнасці было прыцягнута 13 парушальнікаў (з іх 12 — службовыя асобы) на суму 1972,25 рубля. Па вобласці за аналагічныя парушэнні было складзена 49 пратаколаў, сума штрафаў — 9,5 тысячы рублёў.

— Калі падчас праверкі ў нас ёсць сумненне, што тая ці іншая машына не вязе ДМР, мы дазваляем ёй выгрузіць смецце непасрэдна на палігоне, але пры гэтым на месцы вывучаем склад адходаў, — адзначае Марына Уладзіміраўна. — І калі другасныя матэрыяльныя рэсурсы ўсё ж выяўляюцца, выпісваем штраф за іх захаванне.

Па словах інспектара, здараюцца выпадкі, калі ДМР трапляюць на палігон не толькі ад пабочных арганізацый, але і з лініі сартавання. Таму спецыялісты цяпер абмяркоўваюць, як узмацніць кантроль за гэтай часткай адходаў.

— Чалавечы фактар прысутнічае на ўсіх этапах абыходжання з адходамі, — упэўнены Андрэй Сідарук. — Таму на 100 % выключыць выпадкі захавання ДМР немагчыма, але старацца не дапускаць гэта неабходна.

Калі пакаранне на карысць

На палігоне прамысловых адходаў «Вішнёўка», які знаходзіцца за 25 км ад Бабруйска, значна цішэй. Па словах кантралёра-прыёмшчыка Валерыя Катлярова, сюды штодзень прыязджаюць усяго каля 17—20 машын. Яны прывозяць адходы ЦЭЦ-1 і іншыя.

Нягледзячы на лепшыя ўмовы для агляду грузаў, часам і на «Вішнёўцы» некаторыя прадпрыемствы спрабуюць захаваць каштоўны рэсурсы. У такім выпадку супрацоўнікі палігона афармляюць зварот грузу і паведамляюць пра факты парушэння заканадаўства ў гаррайінспекцыю. Сумесная праца дае добрыя вынікі — на сёння, па словах Валерыя Катлярова, прысутнасць ДМР у адходах прамысловасці значна знізілася.

Але пры гэтым ёсць і іншыя праблемы — напрыклад, нядобрасумленнае афармленне дакументаў. Так, адна з машын філіяла «Бабруйскі гаррайпаліваздбыт» прывозіць на палігон пілавінне і іншыя драўняныя адходы. А ў суправаджальным пашпарце гэта змёт пасля ўборкі тэрыторыі прадпрыемства. У выніку машына з няправільным грузам накіроўваецца назад. За гэта таксама прадугледжваюцца адміністрацыйныя санкцыі.

— Меры адміністрацыйнага ўздзеяння аказваюць станоўчы эфект на дзейнасць прадпрыемстваў, — упэўнена Марына Абрамава. — З іх дапамогай за апошні час значна зменшылася колькасць парушэнняў, у тым ліку і ў вобласці захавання ДМР. Пры гэтым на месцах узмацніўся кантроль па арганізацыі паасобнага збору адходаў.

А з насельніцтвам лепш працуюць іншыя механізмы — устаноўка большай колькасці кантэйнераў для паасобнага збору адходаў, адкрыццё прыёмных пунктаў ДМР, а таксама растлумачальная работа.

У кожнага адходу — свой кошт

Што датычыцца прыёмных пунктаў другаснай сыравіны, то іх у раёне даволі шмат. Адзін з іх знаходзіцца непасрэдна на палігоне «Бабіна», у Бабруйску такія аб'екты працуюць на базе кожнага ЖЭУ, буйных гандлёвых кропак і інш. Каля пяці гадоў дзейнічае і пляцоўка для паасобнага збору другасных бытавых адходаў ад насельніцтва УКВП «Прамадходы».

— Мы прымаем макулатуру, пластык, адпрацаваныя маслы, шкло, старую бытавую тэхніку (халадзільнікі, тэлевізары, газавыя пліты і інш.), а таксама энергазберагальныя лямпы і батарэйкі, — расказвае нарыхтоўшчык Вячаслаў Баранаў. — За здачу ўсіх гэтых відаў адходаў (акрамя элементаў сілкавання) людзі атрымліваюць грошы згодна з прэйскурантам. Сабраная другасная сыравіна накіроўваецца на перапрацоўку як на мясцовыя, так і іншыя прадпрыемствы.

Па словах спецыяліста, апошнім часам значна больш людзей стала здаваць ДМР у прыёмныя пункты. Пры гэтым інтэнсіўнасць іх здачы залежыць не толькі ад сезона, але і канкурэнтаздольнасці саміх прыёмных пунктаў — людзі шукаюць больш выгадныя прапановы.

* * *

Вырашэнне праблемы вымання другасных матэрыяльных рэсурсаў залежыць ад многіх фактараў. І галоўны з іх — адказнасць за свой участак работы кожнага спецыяліста. Бо калі хоць адна ПЭТ-бутэлька трапіць на палігон ці не будзе выкарыстана, поспеху ў гэтай складанай місіі чакаць доўга.

Вераніка КОЛАСАВА

Жыхары Бабруйска маюць магчымасць здаваць на перапрацоўку і старую бытавую тэхніку.

Галоўнымі інспектарамі па ахове навакольнага асяроддзя Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органаў узмоцнены кантроль за недапушчэннем захавання другасных матэрыяльных рэсурсаў. У жніўні — верасні інспектары праводзяць рэйды па ўсіх палігонах і міні-палігонах ЦКА. Асаблівая ўвага ўдзяляецца недапушчэнню разгрузкі аўтатранспарту, які ўтрымлівае ДМР.

НАШЫ ЗУБРЫ ПАЕДУЦЬ НА БЕРАГ КАСПІЯ?

Беларусь і Азербайджан умацоўваюць супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй ХУДЫК і міністр экалогіі і прыродных рэсурсаў Азербайджана Мухтар БАБАЕЎ падпісалі Праграму на 2018—2019 гады па рэалізацыі Пагаднення паміж міністэрствамі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ад 2010 года.

Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Падчас падпісання Праграмы супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя.

Падчас трохдзённага візіту міністр экалогіі і прыродных рэсурсаў Азербайджана таксама наведаў структурныя падраздзяленні Мінпрыроды, смеццеперапрацоўчы сартавальны завод у раёне палігона «Трасцянецкі», Нацыянальны парк «Белавежская пушча», лясгасы.

— У Беларусі ёсць шмат цікавых напрацовак па пытаннях аховы прыроды, чаму можна павучыцца і прымяніць у Азербайджане. Ёсць, зразумела, і тое, чым мы самі можам падзяліцца, — расказаў Мухтар Бабаеў. — Так, напрыклад, у нашай краіне ёсць перадавыя прадпрыемствы, якія займаюцца перапрацоўкай цвёрдых адходаў. Мы хацелі б падзяліцца сваім вопытам у гэтым кірунку і паглядзець, як гэта пытанне вырашаецца ў Беларусі.

Па словах міністра экалогіі і прыродных рэсурсаў Азербайджана, падпісаная праграма — гэта «дарожная карта» таго, чым міністэрствы будуць займацца ў 2018—2019 гадах. Сярод кірункаў — абмен інфармацыяй і спецыялістамі, работа ў сферы захавання біяразнастайнасці, рэалізацыя сумесных праектаў.

Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй Худык падкрэсліў таксама мэтазгоднасць развіцця супрацоўніцтва паміж прыродаахоўнымі ведамствамі ў галіне геалогіі, разведкі і засваення мінеральных рэсурсаў.

— Для нас важна сёння развіццё мінеральна-сыравіннай базы краіны, а Азербайджан — гэта нафтаздабыўная краіна, там вельмі развіта геалогія, — адзначыў Андрэй Худык. — Таму мы плануем шчыльна супрацоўнічаць у гэтых кірунках. Так, плануецца сустрэча беларускіх і азербайджанскіх арганізацый, якія непасрэдна займаюцца пытаннямі развіцця мінеральна-сыравіннай базы, для вывучэння вопыту абедзвюх краін.

Беларускі бок таксама зацікавіла гідраметэаралагічная дзейнасць у Азербайджане, якая ў гэтай краіне арганізавана на дастаткова высокім узроўні.

— У Беларусі гэта работа таксама вядзецца сур'ёзна, ідзе мадэрнізацыя, укараняюцца новыя тэхналогіі, але нам цікавы і вопыт іншых краін, — падкрэсліў Андрэй Худык. — У сваю чаргу азербайджанскі бок выказаў жаданне разгледзець пытанне аб набыцці зубра еўрапейскага для развіцця папуляцыі гэтай жывёлы ў сябе.

Вераніка КОЛАСАВА.

■ На сваім месцы

Ігар БАРОДЗЬКА:

«Шукаем аднадумцаў сярод неабыякавых»

З кім у Магілёве ўзгадняюць высечку дрэў і навошта ў горадзе заглыбленыя кантэйнеры для смецця

Магілёў — горад прыгожы, нават, можна сказаць, святочны. За сезон тут высадзілі паўтара мільёна штук кветак! Традыцыйная для нашай краіны чысціня на вуліцах і добраўпарадкаванне паркаў — усё гэта праца многіх гарадскіх структур. А Магілёўская гарадская інспекцыя прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя нярэдка выступае арганізатарам і каардынатарам праектаў, накіраваных на стварэнне камфортнага асяроддзя ў горадзе. Пра супрацоўніцтва з гарадскімі службамі і актывістамі-эколагамі распавёў намеснік начальніка Магілёўскай інспекцыі Ігар БАРОДЗЬКА.

— Цяпер вядуцца работы па фарміраванні новага парку адпачынку гараджан Падніколле. А што адбываецца ў Пячэрскім лесапарку, які да нядаўняга часу быў адзінай тэрыторыяй у межах горада, прызначанай для баўлення вольнага часу на прыродзе?

— Рашэннем Магілёўскага гарвыканкама ў 2017 годзе зямельны ўчастак для абслугоўвання Пячэрскага лесапарку пераведзены з катэгорыі земляў населеных пунктаў у землі лясного фонду. У сувязі з адсутнасцю неабходных прававых дакументаў інспекцыя прыпыніла работы на тэрыторыі Пячэрскага лесапарку да зацвярджэння лесаўпарадкавальнага праекта. Цяпер КПУП «Магілёўзелянбуд» распрацавала гэты нарматыўны дакумент, які прайшоў дзяржаўную экалагічную экспертызу. Згодна з праектам, праводзяцца ачыстка ад захламленасці тэрыторыі лесапарку, выбарачныя санітарныя рубкі. Суцэльныя санітарныя рубкі, паводле матэрыялаў лесаўпарадкавання, не прадугледжаныя.

Сваімі рукамі інспекцыя можа далёка не ўсё, а вось прыцягнуць да супрацоўніцтва спецыялістаў, каб справа была пастаўлена на прафесійныя рэйкі, — гэта ў нашых сілах. Мы шукаем аднадумцаў сярод неабыякавых, тых, хто любіць свой горад.

Так, па патрабаванні інспекцыі «Магілёўзелянбуд», установа, якая абслугоўвае Пячэрскі лесапарк, запрасіла спецыялістаў Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, каб яны абследавалі лесапарк. Высветлілася, што дрэвы пакутуюць на караеда. Гэта пошасць, як вядома, распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе. Хворыя дрэвы падлягаюць выбарачнай санітарнай высечцы, і калі яе не правесці, то вельмі хутка ў парку не застанецца здаровых дрэў — вось гэта мы тлумачылі насельніцтву. Навукоўцы з Інстытута эксперыментальнай батанікі выявілі ў парку некалькі чырванакніжнікаў. Увосень рыхтуецца яшчэ адно абследаванне. Зноў жа актывісты прапануюць увесь парк прыняць пад ахову, але наколькі гэта рацыянальна для месца масавага адпачынку гараджан? На мой погляд, статус асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі неабходны для асобных участкаў парку. Пытанне аб прысваенні статусу ААПТ будзе разглядацца пасля правядзення навукоўцамі абследавання. Цяпер у штаце «Магілёўзелянбуда» ўведзена пасада спецыяліста па лесаўпарадкаванні.

— Высечка дрэў ажыццяўляецца не толькі ў парку. І нярэдка гэта прыярытэтная тэма мясцовых актывістаў. Ці атрымліваецца знаходзіць з імі агульную мову?

— На жаль, пры будаўніцтве тых ці іншых аб'ектаў даводзіцца ахвяраваць дрэвамі. Мы прапануем забудоўшчыку правесці кампенсацыйныя пасадкі дрэў, а не выплату за знесеныя. Усё проста: знеслі тры дрэвы — пасадзілі дзевяць, адразу заўважны вынік.

Інспекцыя актыўна супрацоўнічае з грамадскасцю, якой неабыякава, у якім асяроддзі мы жывём. Напрыклад, у горадзе створана ініцыятыўная грамадская група «Выратуем Пячэрскі лесапарк». Мы стараемся знаходзіць узаемапаразуменне. Так, пасля праведзеных кансультацый прадстаўнікі ініцыятыўнай групы выказалі меркаванне, што правядзенне работ па выдаленні сухастойных, зажаных шкоднікамі дрэў і кустоў неабходна. Між тым пры ачыстцы ўчасткаў лесу ад захламленасці магчыма пашкоджанне жывога надглебавага покрыва, што, у сваю чаргу, можа прывесці да знішчэння месцаў росту раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Беларусі. Па выніках сумеснага абследавання прынята рашэнне не праводзіць у меркаваных месцах росту чырванакніжнікаў работы па ачыстцы лесу ад захламленасці да таго часу, пакуль навукоўцы не правядуць ацэнку Пячэрскага лесапарку ў якасці патэнцыйнай ААПТ. А пакуль сухая і хворая расліннасць выдаляецца непасрэдна ў месцах масавага наведвання насельніцтвам (уздоўж прагулачных дарог, сцежак, побач з будынкамі і г. д.).

— Заглыбленыя кантэйнеры для смецця даўно не навінка ў Еўропе. Раскажыце, Ігар Васілевіч, як яны з'явіліся ў вашым горадзе?

— Па ўсёй краіне заварваюць смеццеправоды ў шматпавярховых дамах. Гэта правільна, але ўзнікае пытанне: а куды падзець адходы? Вядома ж, па праекце дваровых тэрыторый у старым жылым шматпавярховым фондзе кантэйнерныя пляцоўкі не прадугледжаны. Разам з Аператарам другасных матэрыяльных рэсурсаў вырашылі выкарыстаць вопыт краін Еўропы і ўжо ўсталявалі ў горадзе 85 заглыбленых у грунт смеццевых кантэйнераў для збору цвёрдых камунальных адходаў і ДМР.

Асноўны прынцып гэтага метаду — вертыкальнае размяшчэнне кантэйнера, які на 2/3 знаходзіцца пад зямлёй, а на паверхні застаюцца толькі кампактныя і прыгожыя смеццепрыёмнікі. Асноўныя перавагі гэтай тэхналогіі — назапашванне і часовае захоўванне адходаў — бясспрэчныя. Так, заглыблены кантэйнер аб'ёмам 5 м³ роўны па ёмістасці 7 металічным кантэйнерам і 5 еўракантэйнерам. Пад уласнай вагой смецце прасуецца і да моманту вывазу займае аб'ём меншы, чым звычайна. Герметычнасць кантэйнераў прадухіляе забруджванне навакольнага асяроддзя, не прапускае непрыемныя пахі, а паніжаная тэмпература грунту на глыбіні перашкаджае распаўсюджванню бактэрый. Спецыяльнае вечка прадухіляе доступ бадзяжных жывёл і птушак. Канструкцыя кантэйнераў забяспечвае чысціню на пляцоўцы: смецце пры выгрузцы не рассыпаецца і не разлятаецца. Апаражненне кантэйнераў адбываецца пры дапамозе смеццявозаў, забяспечаных кранава-маніпулятарнай установкай, пры гэтым сам смеццявоз можа не пад'язджаць да месца выгрузкі ўшчыльную.

Жыхары станоўча ацанілі такія кантэйнеры. Цяпер заглыбленыя кантэйнеры ўсталёўваюцца каля кожнай новабудоўлі. Эксперымент атрымаўся, і да канца года ў горадзе з'явіцца яшчэ 60 такіх кантэйнераў.

Таксама хачу адзначыць, што ў горадзе 80 гаражных кааператываў, якія на 100 % ахоплены дамовамі на вываз ЦКА. І ў цэлым мы кантралюем выкананне прыродаахоўнага заканадаўства на такіх тэрыторыях. Адным словам, робім усё магчымае, каб павялічыць бытавую культуру насельніцтва і пераканаць людзей берагчы прыроду.

Аксана ЯНОЎСКАЯ

■ У свеце жывёл

Рамонт хатак для вяртлявай чаротаўкі

Як праект «Ветландс» дапамагае захаваць рэдкіх птушак

Заказнікі «Спораўскі» і «Званец» — амаль адзіныя ў Беларусі месцы, дзе захавалася большая частка сусветнай папуляцыі самай рэдкай у Еўропе пеўчай птушкі — вяртлявай чаротаўкі. Яшчэ два дзесяцігоддзі таму яна сустракалася не менш чым у 20 краінах, а цяпер яе колькасць скарацілася ажно на 95 %. Асноўная прычына такіх змен — зарастанне нізінных балот і паплаўных лугоў расліннасцю, упэўнены спецыялісты.

Калісьці балоты вельмі актыўна выкарыстоўваліся мясцовымі жыхарамі: яны пасвілі там скаціну, нарыхтоўвалі сена. Дапамагалі пазбавіцца ад «лішняй» расліннасці і дзікія жывёлы: ласі, казулі, алені і г. д. Аднак з цягам часу як людзі, так і жывёлы пакінулі балоты, і апошнія пачалі хутка зарастаць. Паскорылі працэс яшчэ і біягенныя элементы, якія сцякаюць сюды з найбліжэйшых вадаёмаў. У такіх умовах большая частка рэдкіх птушак, у тым ліку і вяртлявая чаротаўка, жыць не могуць. Таму супрацоўнікі заказнікаў «Спораўскі» і «Званец» узяліся за вырашэнне праблемы.

Актыўныя дзеянні па выдаленні расліннасці распачаліся яшчэ падчас праекта «Кліма-Ігст», у рамках якога была закуплена неабходная тэхніка. Аднак, па словах **дырэктара заказніка «Спораўскі» Вадзіма ПРАТАСЕВІЧА**, для работы ёсць не так шмат часу, пакуль не пачнецца сезон гнездавання — таму абсталявання вельмі часта не хапае.

— Каб забяспечыць птушкам камфортнае існаванне, толькі на тэрыторыі нашага заказніка неабходна ачысціць каля 2 тыс. га, і дзесьці 4,5 — у «Званцы», — дадаў спецыяліст.

Дапамагчы з гэтым павінен пяцігадовы праект «Устойлівае кіраванне лясны мі і водна-балотнымі экасістэмамі для дасягнення шматмэтавых пераваг» («Ветландс»), які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізоўваецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Па словах арганізатараў праекта, закупленая тэхніка абавязкова будзе лёгкая і з іншымі якасцямі, неабходнымі для работы менавіта на нізінных балотах.

Аднак «Чым касіць?» — не адзінае пытанне для супрацоўнікаў заказнікаў, ёсць яшчэ і іншае — «Куды дзець скошанае?».

— Штосьці мы выкарыстоўваем на сена, штосьці — на падсцілку, аднак гэта невялікая колькасць, большая частка застаецца. У нас з'явілася ідэя рабіць са скошанага біягумус пры дапамозе каліфарнійскага чарвяка, і ўжо ёсць пробная пляцоўка. Спадзяёмся, што заказы на ўгнаенне будуць. Мы глядзім на перспектыву, а не так: праект скончыўся, значыць, і работа таксама, — падзяліўся Вадзім Пратасевіч.

Акрамя перспектывы ў продажы арганічнага ўгнаення, дырэктар заказніка «Спораўскі» бачыць яе ў яшчэ адным кірунку — турыстычным. І для гэтага ёсць падстава: з кожным годам ахвотных паглядзець на птушак становіцца ўсё больш і больш. Асабліва любяць адпачываць у «Спораўскім» еўрапейскія турысты, але прыязджаюць бёрдвотчары і з Амерыкі, з Канады, а ў Шатландыі, напрыклад, ужо ёсць нават фан-клуб заказніка.

— Пакуль, на жаль, беларусаў вельмі мала. У асноўным гэта арнітолагі ці іншыя спецыялісты сумежных галін. Праўда, апошнім часам заглядваюць да нас і гарадскія школьнікі. Патрэбен час, у Еўропе бёрдвотчынг таксама не адразу з'явіўся, — падкрэсліў спецыяліст. — Што датычыцца замежных турыстаў, то ім абавязкова трэба даваць гарантыі. Скажаш, што на 99 % яны ўбачаць птушку — дакладна прыедуць, у астатніх выпадках — ужо не факт.

У «Спораўскім» можна паглядзець не толькі на вяртлявую чаротаўку — на гэтай тэрыторыі жыве каля 40 рэдкіх відаў птушак, насякомых, раслін. Сярод іх — вялікі арлец, дупель і г. д. Таму так важна падтрымліваць гэта балота і іншыя аналагічныя месцы ў добрым стане.

Кацярына ЦІТОВА

Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 47-20-56.

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221285907101000084, площадью 0,1498 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Красный Двор, ул. Центральная, У-3 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона реки, водоема (оз. Краснодворское). **Нач. цена**: 2 000,00 бел. руб. **Задаток:** 200,00 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140901730000000 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельсовет)
Дата, время и место проведения аукциона: 22.10.2018 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 18.09.2018 с 8.30 по 19.10.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь)
Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221285909101000046, площадью 0,1447 га, по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Лущиха, ул. Набережная, участок № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (р. Западная Двина). **Нач. цена:** 2 500,00 руб. **Задаток:** 250,00 руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY89AKBB36003140901730000000 ОАО «АСБ«Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа – 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Мазоловский сельсовет)
Дата, время и место проведения повторного аукциона: 03.10.2018 в 12.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 18.09.2018 с 8.30 по 02.10.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь)

Аукционы проводятся в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв. м, расположенное по адресу г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18

Начальная цена продажи – 61 542 руб. (шестьдесят одна тысяча пятьсот сорок два рубля) с учетом НДС

Сумма задатка – 6 154 руб. (шесть тысяч сто пятьдесят четыре рубля)

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 15 октября 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.07.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 9 октября 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

ОАО «БЕЛТРУБОПРОВОДСТРОЙ»

г. Минск, ул. М. Богдановича, д. 129

Советом директоров ОАО «Белтрубопроводстрой» от 17.09.2018 г. в соответствии со ст. 81 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII «О хозяйственных обществах» решено для проведения внеочередного собрания сформировать реестр владельцев ценных бумаг на 17.09.2018 г.

Совет директоров.

УНП 100364117

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15061 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина), общей площадью 507,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. Карла Маркса, 16

Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым № 422950100001002709, площадью 0,0743 га (назначение – земельный участок для размещения объектов розничной торговли (для обслуживания здания магазина «Ритуалы»)), расположенном по адресу: г. Ивье, ул. Карла Маркса, 16

Начальная цена продажи – 40 896 руб. (сорок тысяч восемьсот девяносто шесть рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 2 045 руб. (две тысячи сорок пять рублей)

Продавец – Ивьевский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231337, Гродненская область, г. Ивье, ул. Энгельса, 5, тел. 2-11-67, факс 2-23-95

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона:

Расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя.

Право собственности переходит к Покупателю после передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

Документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи.

Расходы, связанные с проведением аукциона (в том числе по уплате вознаграждения Организатору торгов в размере 5 % от конечной цены продажи), подготовкой документации, необходимой для его проведения, и публикации извещения в средствах массовой информации и размещения на официальном сайте, возмещаются Победителем аукциона Ивьевскому филиалу Гродненского областного потребительского общества.

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 28 сентября 2018 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 11.04.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 24 сентября 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 2: капитальное строение, инв. № 400/С-87058 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – здание магазина), обшей площадью 89,0 кв. м, расположенное по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А

Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422087505601000080, площадью 0,0366 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0366 га

Начальная цена продажи – 5 406,75 руб. (пять тысяч четыреста шесть рублей семьдесят пять копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 540 руб. (пятьсот сорок рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Лот 3: изолированное помещение, инв. № 400/D-161210 (назначение – административное помещение, наименование – административное помещение), площадью 378,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-5; изолированное помещение, инв. № 400/D-161205 (назначение – помещение, не относящееся к жилищному фонду, наименование – нежилое помещение), площадью 38,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41-7; капитальное строение, инв. № 400/С-102483 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 88,55 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102484 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть), протяженностью 95,6 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; капитальное строение, инв. № 400/С-102486 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопровод), протяженностью 12,35 п. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 41; электрическая сеть КЛ-0,4 кВ от РУ-0,4 кВ ТП-17 до ВУ административного здания (марка кабеля АААШв 3х95), протяженностью 150 м; зеленые насаждения: ель – 7 штук

Лот № 3 расположен на земельном участке, кадастровый номер 440100000001006134, (назначение – земельный участок для обслуживания здания административно-хозяйственного назначения), площадью 0,1982, расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Озерское шоссе, 41

Начальная цена продажи – 156 562,50 руб. (сто пятьдесят шесть тысяч пятьсот шестьдесят два рубля пятьдесят копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 15 656 руб. (пятнадцать тысяч шестьсот пятьдесят шесть рублей)

Условия проведения аукциона – аукцион без условий

Продавец – Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 15 октября 2018 г. в 10.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.06.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений – 9 октября 2018 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «ОКСАНА»

Предмет торгов	Начальная цена без НДС, руб.	Размер задатка, руб.
Лот № 1 Незавершенное законсервированное капитальное строение, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 121285007101000067, площадью 1,3467 га, по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Мощенка, 33	180 000,00	18 000,00

Условия продажи	Без условий
Организатор торгов	РУП «Институт недвижимости и оценки» Брестский филиал
Срок заключения договора купли-продажи	В течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона
Условия оплаты	В соответствии с заключенным договором купли-продажи
Номер р/с для перечисления задатка	BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, г. Брест, ул. Мицкевича, 10, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245

Аукцион состоится 19 октября 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционных торгах, а также иную информацию об объектах торгов, можно узнать у организатора аукционных торгов по телефонам: 8 (0162) 20-92-13, 21-88-81, 8 (029) 626-72-52

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00

Последний день приема заявлений – 18 октября 2018 г. до 17.00

Вячаслаў ГРЭЦКІ:

«ЧАСАМ НАЗЫВАЮЦЬ МЯНЕ УЭЙНАМ»

Пра знакамітае прозвішча і сучаснасць беларускага хакея

Напэўна, кожны аматар спорту ведае прозвішча Грэцкі і разумее, што звязана яно з хакеем. Канадзец, адзін з самых вядомых спартсменаў XX стагоддзя, чатыры разы ён выйграваў самы прэстыжны трафей у сусветным хакеі — Кубак Стэнлі. Мала хто ведае, што карані «Вялікага», менавіта такую мянушку ён атрымаў у часы гульнявой кар'еры, ідуць з Беларусі. Дзядуля Уэйна Грэцкі Цярэнцій Лаўрэнцьевіч імігрыраваў у Канаду з Гродзенскай губерні, там ён ажаніўся з украінкай Марыяй з горада Падгайцы (цяпер Цярнопальская вобласць Украіны).

Якое было наша здзіўленне, калі ў заявачным спісе хакейнага клуба «Дынама-Маладзечна» мы ўбачылі менавіта гэтае прозвішча. Беларускі нападаючы Вячаслаў Грэцкі — ураджэнец Гродна, раней ён выступаў за мясцовы «Нёман» і хакейны клуб «Ліда». З нападаючым мы пагаварылі пра яго вядомае прозвішча, сувязь з вялікім хакеістам і легендарную перамогу беларусаў над шведамі, з якой пачаўся хакей для Вячаслава.

«Хакей — гэта спорт, звязаны з рызыкай для жыцця, таму грошы, я лічу, цалкам апраўданыя. Ну і нарэшце, ніхто не перашкаджае кожнаму стаць хакеістам, калі гэта так лёгка».

* * *

— Пачнём з надзённага. Ваш пераход у «Дынама-Маладзечна» можна лічыць плюсам у кар'еры?

— Адназначна. Тры гады запар я пачынаў перадсезонную падрыхтоўку з «Нёманам-2», гэта было таптанне на месцы. Першы раз адтуль у арэнду ў Маладзечна мяне забраў Дзмітрый Краўчанка, потым я аказаўся ў «Лідзе», але Дзмітрый Аляксандравіч выцягнуў і адтуль. Я быў гэтаму вельмі рады, прыемна працаваць з чалавекам, які бачыць цябе ў камандзе, выдатна да цябе ставіцца. Гэта дае штуршок і матывацыю.

— Сёлета камандай кіруе ўжо Юрый Файкоў, якія ён ставіць задачы перад вамі?

— Як ва ўсіх камандаў у нас толькі адна задача — перамагаць.

— Каго бачыце сваімі асноўнымі канкурэнтамі?

— Складана назваць канкрэтныя каманды. Сёлета ўсе будуць канкурэнтамі, таму што чэмпіянат узмацніўся, каманды сталі бліжэйшыя па ўзроўні гульні, гэта паказаў і Кубак Салея.

— Як ацэніце старт каманды?

— Мы прайшлі вельмі добрую перадсезонную падрыхтоўку, працавалі старанна, па дзве трэніроўкі ў дзень. Рабілі ўсё, каб на старце сезона атрымаць трафей у выглядзе Кубка Салея, на жаль, не выйшла. Прабіліся ў фінал, але там прайгралі. Калі казаць пра асабісты вынік, то пакуль што для мяне гэта найлепшы старт сезона.

— З нагоды рэформаў, якія адбыліся ў нашым хакеі, выказваліся трэнеры і функцыянеры, але мала казалі гульцы.

— Змены, якія датычацца ўзросту, мне здаецца, мала што памянялі. З нагоды падзелу экстралігі на дывізіёны, думаю, гэта адназначна станоўчы крок. Наш чэмпіянат будзе больш цікавы, як для хакеістаў, так і для балельшчыкаў, будзе больш барацьбы і больш гульняў. Што датычыцца заробкаў, я, як малады гулец, не магу адказаць на гэтае пытанне, бо вялікіх грошай і так не атрымліваў, напэўна, аб гэтым лепш пытацца ў больш дасведчаных хакеістаў.

— Наогул, ходзіць меркаванне, што хакеісты незаслужана высокааплатныя спартсмены.

— Адмоўна і негатыўна стаўлюся да такіх выказванняў, таму што ніхто не ведае, якім жыццём на самай справе жывуць хакеісты. Яны прыйшлі ў спорт у 7-8 гадоў, з гэтага часу штодзённыя трэніроўкі. Пару тыдняў на адпачынак летам. Мала хто думае аб тым, што хакеіст можа скончыць сваю кар'еру ў любы момант, гэта можа здарыцца заўтра ці праз 20 гадоў, калі пашанцуе больш. Плюс хакей — гэта спорт, звязаны з рызыкай для жыцця, таму грошы, я лічу, цалкам апраўданыя. Ну і нарэшце, ніхто не перашкаджае кожнаму стаць хакеістам, калі гэта так лёгка.

— Памятаеце, куды патрацілі свае першыя зароблены грошы?

— Я не ведаў, што з імі рабіць, частку аддаў бацькам, а астатнія пайшлі на нейкія дробязі. Зарплата была невялікая, для добрай пакупкі з адной зарплаты яшчэ трэба добра папрацаваць.

* * *

— Вам часта задаюць пытанні пра прозвішча?

— Так. Роднаснымі сувязямі я ніяк не датычны да Уэйна Грэцкі, мы проста цёзкі па прозвішчы. Магчыма, калі б мы былі сваякамі, я б тут ужо не гуляў *(смяецца)*.

— Вы таксама з Гродна, як і дзядуля Уэйна, ніколі не цікавіліся паходжаннем свайго прозвішча?

— Пакуль такога жадання не было. Адзінае, ведаю, што гэта хутчэй польскае прозвішча.

— Можа, яно і стала штуршком, каб пачаць займацца хакеем?

— Наўрад ці, бо я стаў на канькі ў гадоў 6-7, і гэта быў мой выбар, а не бацькоў, тады і не ведаў пра такога вядомага хакеіста. Атрымалася цікава, першы матч, які я ўбачыў у сваім жыцці, — Беларусь — Швецыя. Наша легендарная перамога ў Солт-Лэйк-Сіці. Мне спадабаўся не столькі хакей, колькі форма шведаў, і я загарэўся жаданнем гуляць.

— Прозвішча калі-небудзь станавілася прадметам жартаў партнёраў па камандзе?

— Яны толькі часам называюць мяне Уэйнам.

— Цікавіліся неяк паглыблена біяграфіяй свайго цёзкі?

— Я, напэўна, як і кожны, добра з ёй знаёмы, таму што гэта вялікі хакеіст, усе ведаюць пра яго заслугі.

* * *

— Ваша прафесійная мара — НХЛ?

— Мара любога хакеіста гуляць у НХЛ і выйграць Кубак Стэнлі. Гэта нават хутчэй не мара, а мэта, бо мэта больш дасяжная, чым мара.

— Што ўваходзіць у сферу вашых інтарэсаў акрамя спорту?

— Хобі асаблівага няма, люблю чытаць, вельмі шмат. У вольны час альбо чытаю, альбо гуляю, з жонкай любім актыўны адпачынак, але не аматары гіперактыўнай тусоўкі. Просты адпачынак для мяне самы лепшы.

— Якая кніга зрабіла на вас самае вялікае ўражанне?

— Кожная кніга можа натхніць і чамусьці навучыць. Першая, якая запала, — гэта Генрык Сянкевіч «Крыжакі». З апошняга, што спадабалася, — цыкл польскага пісьменніка-фантаста Роберта Вегнера «Паданні Меекханскага памежжа». Звычайна заўсёды вылучаюць класіку, але мне неяк больш падабаецца літаратура такога плана. Зараз чытаю гістарычны раман.

— Чытанне — гэта нетыпова для хакеіста...

— Гэта толькі стэрэатыпы. Хакеісты досыць эрудзіраваныя людзі. Я ведаю шмат спартсменаў, якія чытаюць і разбіраюцца добра ў розных сферах. Хоць, нават у школе, часам сустракаўся з такім меркаваннем, калі ты хакеіст, значыць, нічога не ведаеш.

* * *

— Каго з беларускіх хакеістаў вы б назвалі найлепшым у гісторыі?

— Тут адказ відавочны — гэта Руслан Салей. Гісторыі любых спартсменаў, якія нечага дамагліся, натхняюць. Па-свойму добры Салей, і той жа Грэцкі ў свой час, у іншы час — Авечкін. І іх нельга параўноўваць.

«Калі б мы былі сваякамі, я б тут ужо не гуляў».

— Калі казаць аб трэнерах, пад чыім кіраўніцтвам вы марылі б згуляць?

— Гэта, мабыць, самае складанае пытанне. Кожны год з'яўляецца нехта, з кім цікава было б папрацаваць. Наогул, трэнер — гэта адзін з ключавых фактараў у станаўленні хакеіста, ён адыгрывае вельмі вялікую ролю. Мой дзіцячы трэнер Аляксандр Мікалаевіч Супрун уклаў многае, сварыўся нават за адзнакі ў школе, прыдумляў пакаранні за гэта на трэніроўках. Ён стараўся, каб з дзяцей атрымаліся добрыя не толькі хакеісты, але і людзі. А ключавую ролю ў маёй кар'еры, безумоўна, адыграў Дзмітрый Краўчанка, ён даў мне шанц аднавіць сваю кар'еру. Калі б Дзмітрый Аляксандравіч своечасова не паверыў у мяне, я, можа б, ужо скончыў з хакеем, і жыццё склалася б па-іншаму.

Тэніс, барацьба і аўтаспорт

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра самыя актуальныя падзеі выхадных.

1. ***Арына Сабаленка перамагла ў намінацыі «Прарыў месяца» ў жніўні па версіі Сусветнай тэніснай асацыяцыі.*** У галасаванні першая ракетка Беларусі апярэдзіла Настассю Севаставу з Латвіі і ўкраінку Лесю Цурэнка.

Нагадаем, у мінулым месяцы Сабаленка дамаглася перамогі на прадстаўнічым турніры ў Нью-Хейвене, абыграўшы гульцоў першай дзясяткі рэйтынга, а на адкрытым чэмпіянаце ЗША дайшла да 1/8 фіналу, дзе прайграла Наомі Осацы.

Цяпер Арына Сабаленка займае 20-е месца ў рэйтынгу Сусветнай тэніснай асацыяцыі.

2. ***Зборная Беларусі саступіла расіянам у матчы I групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса.*** Да пятай гульні на корце Малой спартыўнай арэны «Лужнікі» каманды падышлі з роўным лікам — 2:2. Перамогу беларусам прынёс у першы дзень Ілья Івашка, абыграўшы Данііла Мядзведзева, і тандэм — Максім Мірны і Андрэй Васілеўскі ў парнай сустрэчы. У заключнай гульні Ягор Герасімаў саступіў Даніілу Мядзведзеву.

Такім чынам, расійскія тэнісісты захавалі месца ў I групе Еўра-Афрыканскай зоны і пачнуць сезон 2019 года з першага раўнда. Беларуская каманда ў кастрычніку 2018 года будзе змагацца са зборнай Славакіі за захаванне прапіскі ў групе.

3. ***Восем узнагарод заваявалі беларускія атлеты на міжнародным турніры па вольнай барацьбе на прызы трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя.*** У мінскім Палацы спорту больш за 300 спартсменаў разыгралі медалі ў дзесяці вагавых катэгорыях у мужчын і жанчын. Першыя месцы занялі беларусы Азамат Нурыкаў (74 кг), Хаджы Раджабаў (86 кг) і Аляксандр Гуштын (97 кг). Сярэбраныя ўзнагароды ў актыве Уладзіслава Андрэева (57 кг) і Марыі Мамашук (68 кг). Трэцяе месца ў зборнай Беларусі занялі Нургун Скрабін (65 кг), Амаргаджы Магамедаў (92 кг) і Ібрагім Саідаў (125 кг).

4. ***Гоншчык «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей Вязовіч перамог у заліку грузавікоў ралійрэйду Turkmen Desert Race «Амуль-Хазар 2018».*** У генеральнай класіфікацыі ўслед за Сяргеем Вязовічам на другім і трэцім месцы размясціліся расійскія экіпажы Айрата Мардзеева і Дзмітрыя Сотнікава адпаведна.

Нагадаем, сёлета Сяргей Вязовіч упершыню ў гісторыі беларускага аўтаспорту заняў другое месца ў самай прэстыжнай гонцы «Дакар 2018».

5. ***Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова ў першым матчы новага сезона Лігі чэмпіёнаў перамог шведскі «Крысціянстад» 32:30 і паклаў у скарбонку першыя два ачкі.*** У групе А нямецкі «Райн Левен» на сваёй арэне мінімальна абыграў іспанскую «Барселону» (35:34), французскі «Манпелье» нечакана саступіў македонскаму «Вардару» (24:27), венгерскі «Веспрэм» адолеў польскі «Віве» (29:27).

Наступны паядынак у Лізе чэмпіёнаў БГК правядзе дома супраць дзеючага чэмпіёна турніру — «Манпелье». Гульня адбудзецца 22 верасня.

6. ***Завяршыліся ўсе матчы 21-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** Брэсцкае «Дынама» перайграла «Тарпеда-БелАЗ» — 2:0, «Слуцк» адолеў у гасцях «Смалявічы» — 2:1, гродзенскі «Нёман» разграміў «Ислач» — 6:0, БАТЭ ўпэўнена перайграў «Дняпро» — 3:1, футбалісты мінскага «Дынама» і «Шахцёра» згулялі ўнічыю — 0:0, «Віцебск» быў мацнейшы за «Мінск» — 3:1. Завяршыўся тур матчам «Гомеля» і «Гарадзеі» ў панядзелак увечары.

Становішча камандаў: 1. БАТЭ (Барысаў) — 51 ачко (20 матчаў), 2. «Віцебск» — 44 (20), 3. «Шахцёр» (Салігорск) — 42 (20), 4. «Дынама» (Мінск) — 42 (20).

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ Брэнд краіны

Папяровыя карункі як антыдэпрэсант

Сакрэты Маладзечанскай школы выцінанкі

Заўсёды прыемна даведвацца пра існаванне новых мастацкіх школ. Нават калі ты ў гэтай школе... вучыўся (маю на ўвазе дзіцячую мастацкую школу горада Маладзечна, дзе ў мяне быў прадмет «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва»). Давялося там пазаймацца і выцінанкай — адкрыць для сябе яе харство і сваімі рукамі выразаць з паперы вытанчаныя малюнкі-карункі. Калі хтосьці ўсё адно не разумее, што ж такое выцінанка, прыгадайце, як у дзяцінстве пад Новы год вы, напэўна ж, выразалі з паперы сняжынкі, каб павесіць іх на вокны, на люстру. Гэта і ёсць самая простая выцінанка. Але зазвычай робіцца яе больш складаны варыянт — прадуманы, лаканічны, з вобразнымі ўзорамі, выразанымі на паперы. Прафесар, даследчык беларускай культуры Яўген Сахута вылучыў маладзечанскую выцінанку як асобную з'яву, са сваёй унікальнай стылістыкай і творчай сістэмай. Убачыць яе вы можаце самі, зазірнуўшы на выстаўку Маладзечанскай школы выцінанкі, якая адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі ў Мінску.

Наталля ЧЫРВОНЦАВА побач са сваімі работамі.

Экспазіцыя складаецца з твораў мастакоў, якія стаяць ля вытокаў гэтай школы: Наталлі Чырвонцавай, Лізаветы Чырвонцавай, Людмілы Валковіч-Борыс.

Выцінанка — вельмі старажытны від мастацтва, аднак з-за развіцця новых тэхналогій у свой час ён прыйшоў у заняпад. Паступовае адраджэнне выцінанкі пачалося з 70-х гадоў XX стагоддзя. Народны майстар Вікторыя Чырвонцава першай стварыла трывалую сістэму навучання майстэрству выразання з паперы спачатку на базе дзіцячай мастацкай школы, а затым на аддзяленні дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Маладзечанскага музычнага каледжа імя Міхала Клеафаса Агінскага. Менавіта дзякуючы яе намаганням утварылася Маладзечанская школа выцінанкі, якая мае свае адметныя рысы: дакладную кампазіцыю, лаканічнасць, сімвалізм, спецыяльныя прыёмы выразання для стварэння тонавай плямы.

— У Маладзечанскай школе выцінанкі выкарыстоўваюцца міфалагічныя вобразы, матывы спадчыны — бяром нават старажытную беларускую архітэктуру, нацыянальныя строі. Усё гэта закладзена ў навучальную праграму, — распавяла **выкладчыца Маладзечанскага музычнага каледжа імя Міхала Клеафаса Агінскага, майстар выцінанкі Наталля ЧЫРВОНЦАВА.** — Сучасныя матывы з'яўляюцца ў творчасці тых майстроў, якія заканчваюць навучанне ў Маладзечне і ідуць у вышэйшыя мастацкія навучальныя ўстановы.

Можна адзначыць такіх сталых майстроў выцінанкі, як Наталля Сухая, Вольга Бабурына. Яны таксама з'яўляюцца яркімі прадстаўніцамі гэтай традыцыі.

— Калі вызначаць пэўную мастацкую школу, то гаворка ідзе пра перадачу ўменняў, асаблівую манеру. Калі вы пагледзіце на работы маладзечанцаў, то ўбачыце адпаведную выразку, прынцыпы, па якіх будуецца кампазіцыя. Такія навыкі перадаюцца ў маладзечанскіх навучальных установах — іх выхадцы нясуць майстэрства далей. Выкладчыкі і настаўнікі выцінанкі працуюць у школах, гуртках, дзіцячых садках.

Самім маладзечанцам гэта можа быць не заўважным, аднак тыя, хто завітвае ў горад у пераднавагоднюю пару, бачаць, што многія гараджане ўпрыгожваюць у такой тэхніцы і свае дамы, і школы, і дзіцячыя садкі. Відавочна, што нават на падсвядомым узроўні гэтае мастацтва ім блізкае.

«Калейдаскоп» Людмілы ВАЛКОВІЧ-БОРЫС.

Вобразы з выцінанак часта пераходзяць і ў іншыя віды мастацтва — напрыклад, у манументальнае. Так, у сталіцы час ад часу з'яўляецца графіці з малюнкамі з выцінанак (арыгіналы Лізаветы Чырвонцавай). Канстанцыя Герасіменка, якая вучыцца у Акадэміі мастацтваў на дызайне касцюма, спрабуе ўвесці пэўныя вобразы ў дызайн вопраткі. Яна рабіла сукенку ў стылі выцінанкі — з прарэзкай па тканіне. Гэта таксама традыцыйны від творчасці Маладзечаншчыны: даўней тут рэзалі тканіну на вялікіх, доўгіх ручніках. Канстанцыя ўзяла такі прынцып прарэзкі, выкарыстала гістарычны эскіз касцюма XI стагоддзя. У выніку атрымаўся надзвычай удалы праект з ільну.

Каля вытокаў Маладзечанскай школы выцінанкі стаяў вядомы мясцовы мастак Юрась Герасіменка-Жызнеўскі. На пачатку развіцця аддзялення дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў музычным каледжы ён выкладаў кампазіцыю. Менавіта гэты творца заклаў графічныя прынцыпы ў выцінанку. Маладыя майстрыхі першапачаткова выразалі выцінанкі па яго эскізах (а іншых узораў папросту не мелі). Цяпер жа ёсць метадычны фонд, на падставе якога навучэнцам прасцей будаваць свае кампазіцыі.

Дагэтуль захаваліся выцінанкі, зробленыя па эскізах Юрася Герасіменкі-Жызнеўскага. Яны знакавыя, як экслібрысы, надзвычай вытанчаныя. Вікторыя Чырвонцава заўсёды раілася з мастаком наконт кампазіцыі твораў: з яе боку прысутнічаў народны погляд на выцінанку, з яго — погляд прафесійнага мастака-графіка. Такім чынам быў закладзены пачатак, нават фундамент Маладзечанскай школы.

— Выцінанка — гэта форма самавыяўлення пачуццяў, — адзначае Наталля Чырвонцава. — Гэта гульня сіметрыі, бо вельмі цікава, калі выява разварочваецца, — і ты атрымліваеш новую кампазіцыю. У гэтым напрамку можна надзвычай шмат вынаходзіць, напрыклад, адступаць ад народных матываў, выяўляць у такой тэхніцы філасофскія думкі. Выцінанка нагадвае каліграфію. У кітайцаў лічылася, што майстэрства прыгожага пісьма развівае шмат духоўных якасцяў і з'яўляецца лекавым. Я таксама лічу, што выцінанка — добры тэрапеўтычны сродак: бярэш нажніцы (не ведаю, ці нейкія кропкі на пальцах задзейнічаны, ці штосьці яшчэ, калі складваеш і выразаеш паперку), але ты атрымліваеш пэўнае задавальненне, і дрэнны настрой сапраўды змяняецца на добры. Такі своеасаблівы антыдэпрэсант. На тое звярталі ўвагу і іншыя нашы выцінаншчыкі. Замежныя майстры таксама заўважалі лекавасць выцінанкі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

❍ Гэта цікава

Узнікненне выцінанкі як аднаго са старажытных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва звязана з вынаходніцтвам паперы ў Кітаі. З распаўсюджваннем тэхналогіі яе вырабу выразанне з паперы рабілася ўсё больш модным у Еўропе. На тэрыторыі Польшчы, Украіны, Беларусі выразанне і выявы з паперы атрымалі назву «выцінанка». Правобразамі выцінанак з'яўляліся кустоіды, якія выкарыстоўваліся для аховы пячатак на дакументах. Яны мелі форму ромба ці разеткі. Кавалак паперы, складзены ў чатыры разы, выразаўся па краі рознымі прыгожымі зубчыкамі.

■ Практычнае радзімазнаўства

ЛЕТАПІСЕЦ МАЛОЙ РАДЗІМЫ

Як жа гэта небяспечна — мець уражлівае сэрца ў нашым меркантыльным свеце! Як гэта балюча — пазнаваць рэчаіснасць праз расчараванні, вучыцца жыццю праз здрады, ісці сваім шляхам праз бясконцыя непаразуменні і супраціў самых блізкіх людзей. Як гэта страшна — быць адзінокім у сваіх памкненнях! І якая гэта асалода — адчуць аднойчы, што сам Усявышні дыхае табе ў патыліцу. Бо толькі яму, Госпаду, вядома сапраўдная наша місія на Зямлі, і таму Ён ніколі не пакіне таго, каго абраў для выканання гэтай місіі.

Вядомая на Смаргоншчыне і Ашмяншчыне краязнавец, гісторык, перакладчыца Таццяна КЛЯШЧОНАК упарта ідзе сваім шляхам, а тыя, хто цікавіцца гісторыка-культурнай спадчынай малой радзімы, удзячны ёй за адкрыцці і знаходкі, за тую шчодрасць, з якой яна дзеліцца сваімі адкрыццямі.

Яе ўлюблёныя мясціны — Смаргоншчына, Ашмяншчына, Маладзечаншчына... Яны асацыююцца найперш з гістарычнай спадчынай Вялікага Княства Літоўскага, з творамі Міхала Клеафаса Агінскага, з раманамі Збігнева Жакевіча. Пасля дзесяцігоддзяў і нават стагоддзяў занядбання, наўмыснага забыцця вяртаецца да нашчадкаў Вялікага Княства іх колішняя слаўная гісторыя, адраджаецца памяць пра тых, хто зрабіў значны ўнёсак у сусветную культуру, сілкуючыся мясцовымі традыцыямі, натхняючыся маляўнічымі краявідамі, музыкай гэтай зямлі і неба, якое сканцэнтравалася ў мелодыях храмаў, палацаў, сялянскіх хацін. Таццяна Іванаўна — толькі адно, але вельмі важнае звяно ў ланцужку рупліўцаў, што пакрысе збіраюць, захоўваюць і папулярызуюць гісторыка-літаратурныя скарбы Віленшчыны, гэтай калыскі сапраўднай сучаснай беларушчыны.

Таццяна Кляшчонак, чалавек Сусвету, хоць і з вельмі глыбокімі духоўнымі каранямі, моцна ўрослымі ў глебу старажытнай Літвы, той краіны, якую ўслаўлялі Адам Міцкевіч, Аляксандр Ходзька, Францішак Багушэвіч, пра адраджэнне якой у межах Вялікага Княства Літоўскага марыў Міхал Клеафас Агінскі. У юбілейны год, абвешчаны ЮНЕСКА годам Міхала Клеафаса Агінскага, Таццяна Кляшчонак, на той час навуковы супрацоўнік музея-сядзібы М. К. Агінскага ў Залессі, выдала некалькі альманахаў, календароў, брашур, прысвечаных славутаму грамадскаму дзеячу, кампазітару і яго таксама вельмі таленавітым нашчадкам.

Калі яна стала лаўрэатам конкурсу імя Ежы Гедройця, заснаванага Польскім інстытутам у Мінску, не ведала, што гэта толькі аванс. Бо яе чакала вялікая і нялёгкая праца — стаць першым перакладчыкам раманаў Збігнева Жакевіча на беларускую мову. З лёгкай рукі прафесара Адама Мальдзіса смаргонская настаўніца польскай мовы ўзялася за такую складаную работу. Было жаданне не проста расказаць пра гэтага пісьменніка і яго творы, а зрабіць даступнай і зразумелай для беларусаў яго знакамітую «Сагу Віленскую». Нешта бясконца штурхала да пісьмовага стала, навязліва будзіла пасярод ночы. У заснежаных зімовых Граўжышках, напэўна, не адну ноч свяцілася яе акно. Там здзяйснялася мара і адраджалася старадаўняя Беларусь — Літва са сваімі адметнымі гукамі і пахамі нацыянальных свят, забабонамі і легендамі, прымхамі і малітвамі. Там сама перакладчыца адчувала, як з глыбіны душы ўзнікаюць захаваныя на генным узроўні пачуцці, асацыяцыі, зусім іншыя катэгорыі ўспрымання рэчаіснасці.

Жыццё не шкадавала, падкідвала ўвесь час праблемы. Трэба было гадаваць дачку, затым унучку, падтрымаць сталую маці, даглядаць хворага бацьку. Нейкі час працавала настаўніцай у польскай школе. Думкамі ж заўжды цягнулася да мілых сэрцу крэўскіх крутых горак, ашмянскіх пакатых пагоркаў і заліўных лугоў уздоўж Вяллі. Нябачны фантом Жакевіча неадступна суправаджаў яе па жыцці: то ўзнікаў выявай беніцкага касцёла Святой Тройцы, то клікаў шырокімі далягляда мі Паніжанаў, то выплываў гоманам залескіх ліпавых прысадаў.

Яна здзейсніла задуму — «Сага Віленская» ў перакладзе на беларускую мову ёсць. Атрыманы і дазвол нашчадкаў спадчыны З. Жакевіча на апублікаванне яе ў Беларусі. Засталося толькі знайсці выдаўца, які б узяў на сябе рызыку надрукаваць твор, што вялікага прыбытку, як і наогул беларуская літаратура, сёння не дае. А за сваю невялікую пенсію перакладчыца выдаць «Сагу Віленскую» не можа. Займаючыся час ад часу перакладамі па замове заказчыкаў, яна пакрысе ўсё ж назапашвае грошы і марыць, што некалі мара яе здзейсніцца.

Ала КЛЕМЯНОК

ПАНТЭОН АЙЧЫНЫ

Мікола Гусоўскі

(1470(?) — пасля 1533)

«Многія народы Еўропы, якія маюць дзяржаўную незалежнасць і якія яшчэ спадзяюцца яе атрымаць, з нязвыклай удзячнасцю пакланіліся б ад сябе і ад нашчадкаў таму свайму сыну, які б пакінуў ім у спадчыну падобны твор, незалежна ад мовы, якой такі твор мог быць напісаны. І першымі сярод іх беспамылкова можна было б назваць славян-беларусаў, старажытная культура якіх пакуль што яшчэ вельмі мала вядома адукаванаму свету, але якія яшчэ ў рамках сумеснай сваёй феадальнай дзяржавы з Літвою мелі такога буйнога паэта, як Мікалай Гусавянін з яго «Песняй пра зубра», напісанай на старажытнай латыні», — гэтак пісаў у 1887 годзе нямецкі перакладчык паэмы Артур Лейст. З XVI стагоддзя загучалі экспрэсіўныя словы беларускага паэта, імя якога ўжо, здавалася, канула ў небыццё. І толькі ў XIX стагоддзі, калі былі адшуканы творы Міколы Гусоўскага, перакладзены на польскую мову і выдадзены, ягонае імя нарэшце заняло сваё пачэснае месца ў сусветнай літаратуры. У даследчыкаў не ўзнікла сумненняў у ягоным беларускім паходжанні.



Мікола Гусоўскі. Мастак Вячка Целеш.

Самі беларусы не ўяўлялі, якім багаццем адарыла іх сляпая прыхамаць гісторыі. Разуменне прыйшло пазней, калі ў 1969 годзе пасля 10-гадовай працы Язэпа Семяжона над перакладам паэмы «Песня пра зубра» выйшла па-беларуску. З таго часу мы пазнаём Міколу Гусоўскага — ягоныя філасофскія, эстэтычныя, рэлігійныя, палітычныя, культуралагічныя погляды і думкі. Вымалёўваецца велічная постаць паэта — мысляра, патрыёта, а вось пра асобу самога Міколы Гусоўскага, на жаль, вядома вельмі мала. Сціплыя звесткі пра яго пранатычна ўзяты з «Песні пра зубра», дзе ён прыгадвае сваё юнацтва, праведзенае ў лясных нетрах:

CARMEN

DE STATURA FERITATE AC VENATIONE BISONTIS.

CRACOVIAE

PETROPOLI

«У нетрах лясных на Літве
калі адбывалася гэта,
Часта і я быў раўнёй мужным
у справе сябрам.
Лёс мой каню даваўраў,
кідаўся ў Дняпро мнагаводны,
Рэчак віры, калі звер
знікнуць хацеў па вадзе.
Не ад таго, што прыгоды любіў,
пагарджаў небяспекай:
Сорамна проста было
раптам ад хлопцаў адстаць.
Шмат перанёс я нягод
у час паляванняў літоўскіх,
Гэты занятак, скажу,
трохі мяне агрубіў...»

Лічыцца, што Мікола Гусоўскі нарадзіўся ў сям'і лоўчага ці асочніка, магчыма, нават вялікакняжацкага. Ягонае прозвішча магло паходзіць ад назвы роднай вёскі ці мясціны Гусава, Гушчава ці Усы, прынамсі апошнюю назву мае прыток Дняпра, праз які Гусоўскі перапраўляўся на кані.

Змалку бацька навучаў сына паляўнічай справе. *«Цікавасць асцярожнага звера, // Ціха, нячутна ступаць, крокам бясшумным, ісці; // Вызначыць, дыша адкуль вятроў ледзь улоўных павеем, // Звер каб цябе не пачуў носам ці вухам сваім, // Добра пацець прымушаў зімой у заснежанай пушчы, // Усклаўшы на плечы мае важкую зброю лаўца»*. Па сутнасці — гэта адзінае, што расказаў пра сябе Мікола Гусоўскі. Невядома, як ён стаў сакратаром вялікакняжацкага пісара Эразма Цёлка (Вітэлія), дзе вучыўся латыні, і ўвогуле шмат чаго невядома. Можна думаць, што дапытлівы розум і прыродная кемлівасць, паэтычнае пачуццё павялі Гусоўскага з лясных нетраў у шырокі свет. Разам са сваім патронам, калі той стаў плоцкім біскупам, Гусоўскі перабіраецца з Вільні ў Плоцк. Высокая пасада Цёлка прыўзняла і становішча Гусоўскага. Ён суправаджаў Эразма Цёлка ў дыпламатычнай місіі ў Рым у 1518—1523 гадах. Мэтай місіі былі перамовы з папскай курыяй аб стварэнні антытурэцкай кааліцыі. Нядаўна знойдзеная лацінская грамата, напісаная «рукамі Мікалая Гусоўскага, натарыуса» 16 чэрвеня 1519 года ў Гонядзі на Падляшшы, можа сведчыць, што ён прыехаў у Рым пазней.

Перамовы з папскай курыяй зацягнуліся. Пэўна, Гусоўскі нудзіўся ў Вечным горадзе і сумавай па радзіме. І гэты сум ён выкажа ў сваёй паэме «Песня пра зубра». Гісторыя яе напісання расказана самім паэтам. Неяк ён у свіце Эразма Цёлка прысутнічаў у Рыме на карыдзе. Від раз'юшаных быкоў нагадаў Гусоўскаму паляванне на зубра. Ён і расказаў пра магутнага волата паўночных пушчаў. Апавяданне так зацікавіла слухачоў, што яны замовілі літвіну напісаць пра зубра паэтычны твор. Як прызнаецца Гусоўскі, ён без асаблівай ахвоты прыняў замову. Выказвалася думка, што замовіў паэму ажно папа Леў X.

Такі-сякі паэтычны вопыт Мікола Гусоўскі ўжо меў — некалькі вершаў, сярод якіх узнёслыя духоўныя літаніі да святых Себасцьяна і Ганны — заступнікаў ад пошасцяў і стыхійных навал. У той час Рым перажываў жахлівую эпідэмію чумы. Вершы гэтыя выліліся з душы паэта, як бяссільны пратэст супраць бязлітаснага пакарання людзей страшнымі няшчасцямі. Здаецца, і «Песня пра зубра» была напісана Гусоўскім у адным творчым парыве, як высокае паэтычнае азарэнне. Гусоўскі бліскуча справіўся з пастаўленай задачай. Ён не толькі рэалістычна апісаў зубра, яго постаць, нораў і павадкі, расказаў пра трагічныя, а то і камічныя выпадкі на ловах на гэтага «волата-звера», але надаў яму сімвалічнае значэнне, падымаючы яго вобраз да высокіх алегорый.

Увогуле Гусоўскі стварыў шматпланавы твор з глыбокім філасофскім сэнсам. Узнёсла гучаць радкі, прысвечаныя роднаму краю, у якіх паказана багацце і шчодрасць ягоных лясоў. Паэт гераізуе часы слаўнага Вітаўта, суворага, але справядлівага гаспадара. Захапляльна расказана, як Вітаўт на ловах гартаваў ваяўнічасць і баявы дух моладзі. Горычу напоўнены словы паэта, калі ён піша аб згубнасці войнаў; мацнее ягоны голас, калі асуджае венцаносцаў за развязванне войнаў. *«Іхны занятак — вайна на пагібель айчыннаму люду, // Гэтай забаве ліхой цалкам сябе аддаюць»*.

Гусоўскі, нібыта прарочы вяшчун, узносіць сваю мальбу да нябесных сіл абараніць людзей ад бед і гора. Гэта святое права паэта, і ён скарыстаўся ім.

Пасля смерці ад чумы ў 1522 годзе свайго патрона Эразма Цёлка Гусоўскі пакідае Рым. Невядома, ці чытаў ён сваю паэму святлейшай асобам з папскай курыі. Паэма была надрукавана ў лістападзе 1523 года на сродкі мецэнатаў у кракаўскай друкарні Гераніма Віетэра і прысвечана каралеве Боне Сфорцы. Але спадзяванні, што каралева ацэніць яе, не спраўдзіліся. Тым не менш паэтычны голас Міколы Гусоўскага не змоўк. У 1524 годзе ў той жа друкарні выходзіць паэма «Новая і слаўная перамога над туркамі ў ліпені месяцы», а праз год — паэма «Жыццё і подзвігі святога Гіяцынта», — пра манаха-прапаведніка XIII стагоддзя, які пашыраў хрысціянства ў Польшчы і на Русі. Вобраз святога вылучаецца духоўнай святасцю. Напоўніцу раскрываецца паэтычны дар Гусоўскага ў другой частцы паэмы, дзе ён асуджае пратэстантаў за знішчэнне святога хараства храмаў. Харство — гэта таксама святыня, уяўная праява Боскасці. Натхнёны і ўзвышаны гэтым хараством чалавек будуе ў душы сваю святыню, каб зрабіцца годным малітвы да Бога. *«Святыні ж — прыстанкі, дзе кожны // Можа збаўлення шукаць»*.

Шчырая рэлігійнасць выдае ў паэце духоўную асобу. А вось у паэме «Новая і слаўная перамога над туркамі ў ліпені месяцы», напісанай Гусоўскім на натхнёным парыве за адзін дзень, ён выступае патрыётам. Паэт услаўляе подзвіг воінаў з народнага апалчэння, якія ў 1524 годзе разбілі над Церамболем грозныя полчышчы туркаў і крымскіх татараў.

Вось так у ягонай душы спалучалася свецкае і духоўнае, прыземленае і ўзнёслае, прагматычнае і шчырае, горычнае і радаснае, грубае і пяшчотнае — усё, што ён аддаў людзям і Богу, злучыўшы іх сваім словам, пакінуўшы сабе толькі імя Мікалай Гусавянін.

Вітаўт ЧАРОПКА.

■ Сваімі словамі

КРАІНА СТАРЫХ АЛЕЙ

Можа, нездарма адна з трох рэчаў, якія павінен зрабіць кожны мужчына, — гэта пасадзіць дрэва? Нядаўна гутарылі пра тое з адным знаёмым. Дрэва як сімвал тваёй эпохі. Як тое, што запачаткавана ўласнымі рукамі і застанецца калі не назаўжды, то вельмі надоўга.

Гаварылі мы і пра тое, што старажытныя алеі, якіх так шмат у Беларусі, — гэта помнікі. Свайго часу. Гаспадароў. Сядзіб, ля якіх іх пасадзілі. Мы не звяртаем на гэта ўвагі, але ж Беларусь — краіна не толькі замкаў. Нават у большай ступені яна — краіна старых алей. І тут, і там растуць яны, у пэўным сэнсе непрыкметныя, — на першы погляд звычайныя дрэвы, нават крыху занядбаныя. А з іншага боку, калі прыгледзецца, калі задумацца, — вось яны, шматгадовыя волаты, якія памятаюць столькі, што нам і ўявіць складана. Якія сняць салодкія сны пра мінуўшчыну.

«Сапраўдным цудам беларускай зямлі можна назваць дарожныя алеі, — піша Армен Сардараў у сваёй кнізе «Шляхастварэнне. Гісторыя і культура беларускіх дарог». — Як зводы фантастычных храмаў, яны вянчаюць нашы дарогі, ствараючы дзівосную карціну, быццам людзі знаходзяцца ўнутры, а не звонку, і зялёны калідор вядзе іх кудысьці ўдалечыню, да нечага далёкага і цудоўнага... Выбітныя і рамантычныя малыя алеі, якія яшчэ жывуць ля старажытных панскіх сядзіб, — сведкі таго жыцця, якое ўжо не вернецца ніколі».

Калі зноў успомніць пра тое, што Беларусь — краіна замкаў — то не так шмат (у параўнанні з былой раскошай) у нас іх захавалася, аднак замкі ўсё-такі ёсць. А вось пра страчанае часта сведчаць алеі. Стаяць яны, маўклівыя, і сваім шапаценнем аплакваюць веліч колішніх гаспадароў і іх маёнткаў. А, можа, чуецца ў гэтым няскоранасць і свабода — маўляў, многае было зруйнавана, але мы стаім і не здадзімся, да апошняга лісціка і галінкі...

Калі падлічыць усе ацалелыя да сёння алеі і ў пэўнай праграме намаляваць тыя пабудовы, што насамрэч стаялі каля іх калісьці, — мы атрымалі б зусім іншую Беларусь! Своеасаблівая паралельная рэальнасць — краіна, багатая на адметную архітэктуру і шляхецкую веліч.

У той жа час прыгадваюцца нейчыя словы: «Яны закатвалі нас асфальтам. Але не ведалі, што мы трава». І тут зусім не маюцца на ўвазе ніякія міфічныя «яны». Проста мы жывём у эпоху глабалізацыі, калі ўсё высакароднае быццам бы застаецца дзесьці ззаду... А свет імкліва імкнецца да ўніфікацыі і аднастайнасці ўсяго. На важныя падзеі, месцы, асобаў часам падае пыл забыцця. Таму задача гісторыкаў, папулярызатараў нашай спадчыны — не даць згінуць усяму гэтаму багаццю, нашаму ўсведамленню сябе вялікай і моцнай нацыяй, у якой за плячыма такая гісторыя, за якую не сорамна.

І вось пасярод ліхалецця і скразнякоў XXI стагоддзя ў Беларусі па-ранейшаму каля дарог стаяць яны, старыя алеі. Вартуюць спакой жыхароў і мінакоў, затуляюць ад ветру, зялёнай лістотай разганяюць смугу руйнавання.

Кожнае такое месца — сведчанне моцных сям'і, роду. Напамін пра карані, і ў пераносным сэнсе, і ў прамым — хоць бы дрэвы за іх па-ранейшаму трымаюцца.

Дык чаму ж мужчынам так важна пасадзіць алею ці хоць бы дрэва?.. Вяртаюся да размовы са знаёмым. Бо тое як пакінуць памятку аб сабе на гэтай зямлі, кажа ён. І нават калі двор, участак прададуць, а дом знясуць і пабудуюць там сабе нешта зусім іншыя людзі... Твае дзеці, унукі змогуць прыйсці і прытуліцца хоць бы да старых дрэў. Падыхаць іх паветрам. Пару жалудоў ці каштанаў пакласці ў кішэню на памяць. Ці проста галінку сарваць і забраць з сабой. Як сведчанне еднасці з каранямі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

Информационное сообщение о проведении повторного аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Глинище, дер. Жажелка, дер. Замлынье и дер. Белая Лужа Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	2 октября 2018 года, в 10.00, г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3	Продавец и его адрес	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881704101000059 в дер. Глинище; **Лот № 2 –** земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881705601000157 в дер. Жажелка; **Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1498 га с кадастровым номером 624881706601000060 в дер. Замлынье; **Лот № 4** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000132 в дер. Белая Лужа
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (1 09 02 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)
7	Начальная цена продажи	Лот № 1 – 7 000,00 рублей Лот № 2 – 7 000,00 рублей Лот № 3 – 3 000,00 рублей Лот № 4 – 5 000, 00 рублей
